УДК 903'13(476.11–13)

# ИССЛЕДОВАНИЯ НА СЕЛИЩЕ ЯСКОВИЧИ-1 В 2018 г.: К ИЗУЧЕНИЮ ПАМЯТНИКОВ «ПРЕДПРАЖСКОГО» ГОРИЗОНТА НА БЕЛОРУССКОМ ПОЛЕСЬЕ

***В. Г. БЕЛЕВЕЦ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Представлены результаты изучения селища у д. Ясковичи Солигорского района Минской области, расположенном на северной окраине Припятского Полесья. Оно было открыто в 2017 г. сотрудницей Института истории Национальной академии наук Беларуси А. Н. Белицкой. В 2018 г. раскопки на памятнике продолжила экспедиция исторического факультета Белорусского государственного университета, изучена площадь 364 м$^2$. В 2017–2018 гг. на селище исследованы две жилые постройки срубной и столбовой конструкции, а также одна хозяйственная постройка и ряд других объектов. Рассматривается основной массив материалов, относящийся к римскому времени. Этот горизонт использования памятника можно синхронизировать с фазами $B_2/C_1$–$C_{1a}$ – $C_2$–$C_3$ римского периода центральноевропейской относительной хронологии (приблизительно со второй половины II или рубежа II–III по начало или середину IV в.). Анализ керамического материала, наиболее распространенных орудий труда – глиняных пряслиц, а также украшений и деталей костюма стиля «варварских» выемчатых эмалей позволяет отнести памятник к киевскому культурному кругу. Находки из жилищ и открытые вокруг них материалы свидетельствуют о том, что жители селища специализировались в обработке цветных металлов, а также, вероятно, в производстве железа. Среди металлических изделий и эпизодически керамического комплекса отмечаются импорты из вельбарской культуры – свидетельства непосредственных контактов общины, использовавшей селище в Ясковичах, с инокультурным и иноэтничным населением – историческими *готами*, которые с конца II в. проникают на земли в среднем течении Припяти. Селище Ясковичи-1, которое активно использовалось лишь в позднеримское время (III – середина IV в.), в перспективе может стать эталонным для центрального

**Образец цитирования:**
Белявец ВГ. Даследаванні на селішчы Яскавічы-1 у 2018 г.: да вывучэння помнікаў «перадпражскага» гарызонту на Беларускім Палессі. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя*. 2019;3:110–145.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2019-3-110-145.

**For citation:**
Beliavets VG. Research in the Jaskavičy-1 settlement in 2018: to the study of the monuments of the «pre-Prague culture» horizon in Belarusian Polesia. *Journal of the Belarusian State University. History*. 2019;3:110–145. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2019-3-110-145.

**Автор:**
***Вадим Георгиевич Белевец*** – кандидат исторических наук; доцент кафедры археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета.

**Author:**
***Vadzim G. Beliavets***, PhD (history); associate professor at the department of archeology and special historical disciplines, faculty of history.
*wadim.bielawiec@gmail.com*

Полесья памятником киевского культурного круга. Даже предварительные результаты его изучения позволяют говорить о заполнении хронологической лакуны между полесскими памятниками постзарубинецкого периода (середина I – II в.) и наиболее ранними, фазы «0», памятниками пражской культуры, носители которой отождествляются с историческими *славянами* эпохи Великого переселения народов. На селище Ясковичи-1 получен новый аргумент в пользу теории об истоках культуры раннеисторических *славян* на землях Припятского Полесья.

***Ключевые слова:*** римский период; киевская культура; Припятское Полесье; формирование пражской культуры; этногенез славян.

# ДАСЛЕДАВАННІ НА СЕЛІШЧЫ ЯСКАВІЧЫ-1 У 2018 г.: ДА ВЫВУЧЭННЯ ПОМНІКАЎ «ПЕРАДПРАЖСКАГА» ГАРЫЗОНТУ НА БЕЛАРУСКІМ ПАЛЕССІ

***В. Г. БЕЛЯВЕЦ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Прадстаўлены вынікі вывучэння селішча каля в. Яскавічы Салігорскага раёна Мінскай вобласці, якое месціцца на паўночным ускрайку Прыпяцкага Палесся. Яно было адкрыта ў 2017 г. супрацоўніцай Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Г. М. Бяліцкай. У 2018 г. раскопкі на помніку былі працягнуты экспедыцыяй гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, вывучана плошча 364 м$^2$. У 2017–2018 гг. на селішчы даследаваны дзве жылыя пабудовы зрубнай і слупавой канструкцыі, адна гаспадарчая пабудова і шэраг іншых аб'ектаў. Разглядаецца асноўны масіў атрыманых матэрыялаў, які належыць да рымскага перыяду. Папярэдне гэты гарызонт выкарыстання помніка можна сінхранізаваць з фазамі $B_2/C_1$–$C_{1a}$ – $C_2$–$C_3$ цэнтральнаеўрапейскай адноснай храналогіі (прыкладна з другой паловы II або рубяжа II–III па пачатак або сярэдзіну IV ст.). Аналіз керамічнага матэрыялу, найбольш распаўсюджаных прылад працы – гліняных праселак, а таксама ўпрыгожанняў і дэталей касцюма стылю «варварскіх» выемчатых эмалей дазваляе аднесці помнік да кіеўскага культурнага кола. Знаходкі з жылля і адкрытыя вакол яго матэрыялы сведчаць пра тое, што жыхары селішча спецыялізаваліся ў апрацоўцы каляровых металаў, а таксама, верагодна, у вытворчасці жалеза. Сярод металічных вырабаў і эпізадычна фрагментаў посуду адзначаюцца імпарты з вельбарскай культуры. Яны сведчаць пра сувязі абшчыны, якая выкарыстоўвала селішча ў Яскавічах, з іншакультурным і іншаэтнічным насельніцтвам – гістарычнымі *готамі*, якія з канца II ст. пранікаюць на землі ў сярэднім цячэнні Прыпяці. Селішча Яскавічы-1, якое актыўна выкарыстоўвалася толькі ў познярымскі час (III – сярэдзіна IV ст.), у перспектыве можа стаць эталонным для цэнтральнага Палесся помнікам кіеўскага культурнага кола. Нават папярэднія вынікі яго вывучэння дазваляюць казаць пра запаўненне храналагічнай лакуны паміж палескімі помнікамі постзарубінецкага перыяду (сярэдзіна I – II ст.) і найбольш ранніми, фазы «0», помнікамі пражскай культуры, носьбіты якой атаясамліваюцца са *славянамі* (лат. *Sclaveni*, *Sclavi*, *Sclavini*) эпохі Вялікага перасялення народаў. На селішчы Яскавічы-1 атрыманы новы аргумент на карысць тэорыі аб вытоках культуры раннегістарычных *славян* на землях Прыпяцкага Палесся.

***Ключавыя словы:*** рымскі перыяд; кіеўская культура; Прыпяцкае Палессе; фарміраванне пражскай культуры; этнагенез славян.

# RESEARCH IN THE JASKAVIČY-1 SETTLEMENT IN 2018: TO THE STUDY OF THE MONUMENTS OF THE «PRE-PRAGUE CULTURE» HORIZON IN BELARUSIAN POLESIA

***V. G. BELIAVETS***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

Unfortified settlement near the Jaskavičy village, Salihorsk District, Minsk Region is located on the northern margin of Pripyat Polesia. The settlement was discovered in 2017 by H. M. Byalickaya, researcher from the Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus. In 2018, archaeological investigation of the settlement was continued by an expedition of Belarusian State University and an area of 364 m$^2$ was excavated there. Two dwelling structures (a log hut and a hut with post walls) and household structure, and several other features were excavated during field seasons of 2017 and 2018. This article deals with the major part of obtained materials that belong to the Roman period. Preliminary, this horizon on the settlement can be synchronized with phases $B_2/C_1$–$C_{1a}$ – $C_2$–$C_3$ according to the Central European relative chronology and roughly can be dated to the period from the second part of the 2$^{nd}$ century or the boundary of the 2$^{nd}$ and 3$^{rd}$ centuries till

the beginning or the middle of 4th century AD. Analysis of pottery, most prevalent tools – clay spindle whorls as well as adornments and pieces of clothing allows to attribute the settlement to the Kyiv cultural circle. Based on the finds from the dwelling structures and their surroundings, it can be assumed that the residents of the settlement were specialized in working with non-ferrous metals and, probably, in iron production. Imports from the Wielbark culture are registered among metal items and, occasionally, fragments of pottery. These imports are the evidences of contacts between community of Jaskavičy-1 settlement and foreign population – *the Goths* who had started to penetrate territories in the middle flow of the Pripyat river from the end of the 2nd century AD. The Jaskavičy-1 settlement, most actively occupied in the Late Roman period (3rd – middle 4th century AD), can become the reference site of the Kyiv cultural circle for the territory of the Central Polesia. Even preliminary results of archaeological investigations there allow to state that the chronological lacuna between Polesian settlements of post-Zarubintsy period (middle 1st–2nd century AD) and the earliest (of phase «0») settlements of the Prague culture form the Migration Period (which is associated with *Slavs* people) is being filled. Hence, at the Jaskavičy-1 settlement we have got a new argument supporting the theory about the beginning of formation of culture of the early *Slavs* in the territory of Pripyat Polesia.

***Keywords:*** Roman period; Kyiv culture; Pripyat Polesia; Prague culture formation; ethnogenesis of the Slavs.

## Уводзіны

Носьбіты пражскай культуры атаясамліваюцца ў сучаснай археалогіі з ядром народа, які з першай паловы VI ст. стаў вядомы пад назвай *славяне* (лат. *Sclaveni*, *Sclavi*, *Sclavini*) (гл. [1]). У канцы IV – V ст. *славяне* разам з роднаснымі ім народамі – *антамі* і, магчыма, *венедамі* – яшчэ ўтваралі агульны этнакультурны масіў. Аднак унутры гэтага свету, які з сучаснай перспектывы ўспрымаецца як раннеславянскі, уласна *славяне* яшчэ не сталі вядучай сілай: не былі найбольш шматлікім народам і не дамінавалі ў ваенна-палітычнай сферы. Вынікі вывучэння археалагічных помнікаў, якія суадносяцца з раннеславянскай супольнасцю эпохі Вялікага перасялення народаў і належаць у першую чаргу да пяньkоўскай, калочынскай і пражскай культур, сведчаць пра тое, што носьбіты апошняй не вылучаліся ў гэтай супольнасці і больш высокім узроўнем эканамічнага і культурнага развіцця. Але ў эпоху Вялікага перасялення народаў і пачатку Ранняга сярэднявечча, з канца IV па VIII ст., славяне не толькі здолелі захаваць сваю тоеснасць, але і перамаглі ў канкурэнтнай барацьбе ўнутры раннеславянскага свету роднасных ім *антаў* ды іншыя, невядомыя нам па назвах народы Усходняй Еўропы. Нашчадкі пераважна насельніцтва пражскай культуры (у гісторыка-культурным, але далёка не заўсёды ў біялагічным плане) да X ст. засялілі разлеглыя прасторы Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, даўшы пачатак большасці сучасных славянскіх этнасаў.

Між тым пытанне пра крыніцы і шлях фарміравання пражскай археалагічнай культуры застаецца адкрытым. Гістарыяграфія праблемы надзвычай абшырная, і яе разгляд значна перавышае магчымасці і задачы гэтага артыкула. Істотна, што адной з найбольш перспектыўных сёння прызнаецца гіпотэза аб фарміраванні пражскіх старажытнасцей у працэсе, блізкім у асноўных рысах да шляху ўзнікнення культур раннеславянскага кола, найперш пяньkоўскай і калочынскай. У Сярэднім Падняпроўі і Дняпроўскім левабярэжжы ён бярэ пачатак у сярэдзіне I ст. – эпосе фарміравання помнікаў познезарубінецкага тыпу – і завяршаецца з крышталізацыяй кіеўскай гісторыка-культурнай супольнасці III–IV стст. [2–8].

Яшчэ ў сярэдзіне 1970-х гг. ленінградскімі даследчыкамі М. Б. Шчукіным і Д. А. Мачынскім на падставе аналізу пісьмовых крыніц і культурнай мадэлі, якую адлюстроўваюць пражскія помнікі, была сфармулявана гіпотэза «палескай белай плямы». Згодна з адным з яе палажэнняў, заключныя фазы этнагенезу раннегістарычных славян адбываліся ў рымскі перыяд і на пачатку эпохі Вялікага перасялення народаў (з сярэдзіны I да мяжы IV–V стст.) на слаба вывучанай прасторы паміж верхнім цячэннем Нёмана і Сярэднім Падняпроўем, а яго эпіцэнтрам былі землі Прыпяцкага Палесся [9–14]. На працягу апошніх дзесяцігоддзяў гэты тэзіс паступова набывае пацвярджэнні і ўсё больш шырокае прызнанне. Пачынаючы з 1980-х гг., дзякуючы раскопкам А. А. Егарэйчанкі на селішчы Востраў і дзесяцігоддзям руплівых даследаванняў В. С. Вяргей, у Прыпяцкім Палессі былі адкрыты і вывучаны шэраг найбольш ранніх з вядомых на сёння селішчаў пражскай культуры (мал. 1, VI) [15; 16, с. 333–334; 17; 18; 19, с. 494–499; 20; 21, с. 49–55]. Працы даследчыкаў атрымалі развіццё ў аналізе матэрыялаў помнікаў пражскай культуры, якія быў прадстаўлены І. А. Гаўрытухіным у публікацыях 1990–2000-х гг. Аб'яднаўшы шэраг помнікаў Беларускага Палесся і тэрыторыі паўночнай Кіеўшчыны, Жытоміршчыны, вярхоўяў Паўднёвага Буга і Днястра, ён вылучыў старажытнасці пачатковай, так званай фазы «0», пражскай культуры, датаваныя другой паловай IV – пачаткам V ст., не выключаючы і больш ранняга часу [22–26].

Адкрыццё на Прыпяцкім Палессі найбольш ранніх помнікаў пражскай культуры паставіла перад беларускімі даследчыкамі новую задачу: неабходна высветліць, ці з'яўлялася гэта насельніцтва аўтахтонным, гэта значыць, ці магла культура раннегістарычных славян VI ст. сфарміравацца ў парэччы Прыпяці і сумежных рэгіёнах.




*Мал. 1.* Гісторыка-культурная сітуацыя на Беларускім Палессі ў рымскі перыяд і на пачатку эпохі Вялікага перасялення народаў: I – помнікі постзарубінецкага гарызонту (сярэдзіна I – рубеж II–III стст.), якія вывучаліся шляхам раскопак; II – помнікі, вядомыя па выніках разведак і выпадковых адкрыццях; III – помнікі вельбарскай культуры (канец II – пачатак V ст.); IV – помнікі кіеўскага культурнага кола (III–IV стст.) на тэрыторыі цэнтральнага Палесся; V – помнікі кіеўскай культуры ў суседніх рэгіёнах; VI – селішчы фазы «0» пражскай культуры (другая палова IV – V ст.); VII – паўднёвая мяжа гарадзішчаў культуры позняй штрыхаванай керамікі; нумарамі абазначаны селішчы: *1* – Яскавічы-1; *2* – Струга-1; *3* – Хотамель-2; *4* – Бярэжцы-4

*Fig. 1.* Historical and cultural situation in the Belarusian Palesia in the Roman period and in the beginning of the Migration Period: I – monuments of the postzarubintsy horizont (the middle of 1$^{st}$ – turn of the 2$^{nd}$–3$^{rd}$ centuries) studied by the excavations; II – monuments known as a result of exploring and accidental discoveries; III – Wielbark Culture monuments (the late 2$^{nd}$ – early 5$^{th}$ century); IV – the monuments of the Kyiv cultural circle (3$^{rd}$–4$^{th}$ centuries) in the Central Polesia; V – Kyiv cultural monuments in the neighboring regions; VI – settlement phase 0 Prague culture (second half 4$^{th}$ – 5$^{th}$ century); VII – the southern boundary settlements Late Hatched Pottery Culture; settlement designated by numbers: *1* – Jaskavičy-1; *2* – Struha-1; *3* – Chotameĺ-2; *4* – Biarežcy-4

З пачатку 2000-х гг. практычна на ўсім поўдні Беларусі – ад Заходняга Буга па Дняпро – былі адкрыты помнікі сярэдзіны I – мяжы II–III стст., роднасныя добра вядомым у Сярэднім Падняпроўі і Дняпроўскім левабярэжжы помнікам позназарубінецкага тыпу (гл. мал. 1, I, II). Яны ўсё яшчэ нешматлікія і патрабуюць далейшага пошуку і вывучэння, але сама наяўнасць гэтага гісторыка-культурнага гарызонту сёння павінна ўспрымацца як навуковы факт (гл. [27–29]). У храналагічнай (яшчэ не культурнай) секвенцыі гісторыка-культурнага развіцця насельніцтва паўднёвай Беларусі ў «перадпражскі» перыяд застаецца малавывучаная лакуна паміж палескімі постзарубінецкімі і найбольш раннімі пражскімі старажытнасцямі – познярымскі час (каля 200–220 – 360–375 гг.). Дзякуючы даследаванням В. С. Вяргей і Г. М. Бяліцкай помнікі з матэрыяламі гэтага перыяду, супастаўляльнымі са старажытнасцямі кіеўскага культурнага кола, былі адкрыты на шэрагу помнікаў Прыпяцкага Палесся [20, с. 243–244; 29; 30] (гл. мал. 1, *2–4*). Адна з істотных праблем палявых даследаванняў па гэтай тэме заключаецца ў тым, што землі на поўдні Беларускага Палесся моцна забагненыя і часта нават невялікія ўзвышшы выкарыстоўваліся тут з каменнага веку да сучаснасці. Таму цэнтральнапалескія помнікі, якія ўтрымліваюць у тым ліку матэрыялы першай паловы 1-га тыс. н. э., пераважна шматслойныя, са складанай стратыграфіяй, а іх культурны пласт у большай альбо меншай ступені парушаны пазнейшымі напластаваннямі. Вылучыць на іх матэрыялы вузкага храналагічнага адрэзка (а ў выпадку «перадпражскага» гарызонту гэта ўсяго 150–200 гадоў) тэхнічна складана. Значна аблегчыць працэс можа пошук і даследаванне максімальна «чыстых» помнікаў познярымскага часу (III – сярэдзіны IV ст.).

У гэтым артыкуле прадстаўлены вынікі даследаванняў 2018 г. на селішчы Яскавічы-1, размешчаным на паўночным ускрайку Цэнтральнага Палесся (мал. 1, *1*), якое ў перспектыве можа стаць адным з такіх эталонных помнікаў «перадпражскага» часу.

## Вывучэнне культурнага пласта

**Гісторыя даследаванняў.** Селішча каля в. Яскавічы Салігорскага раёна Мінскай вобласці было адкрыта Г. М. Бяліцкай летам 2017 г. дзякуючы ініцыятыве членаў Салігорска-слуцкага аддзялення Беларускага добраахвотнага таварыства па ахове помнікаў гісторыі і культуры Ю. А. Кітуна і В. Г. Іванова. У чэрвені 2017 г. яны паведамілі супрацоўнікам Інстытута гісторыі НАН Беларусі пра рэчы III ст., знойдзеныя тут скарбашукальнікамі. Неўзабаве знаходкі перадалі Г. М. Бяліцкай. У 2017 г. даследчыцай пры падтрымцы валанцёраў на гэтым помніку былі праведзены зборы, пошук з дапамогай металадэтэктара і шурфоўка на плошчы 20 м$^2$. Шурфам, разбітым на месцы выяўлення лунніцы з эмалямі, было адкрыта і амаль цалкам вывучана жытло, якое Г. М. Бяліцкая датавала канцом II – III ст. Даследчыца адзначыла блізкасць форм посуду, знойдзенага на помніку, да зарубінецкага, так званага позняга этапу зарубінецкай культуры і ранняга гарызонту пражскай культуры [31, с. 572].

Летам 2018 г. даследаванні на помніку былі працягнуты экспедыцыяй гістарычнага факультэта БДУ. Раскопкі вяліся ў рамках летняй археалагічнай практыкі студэнтаў першага курса з удзелам магістрантаў і валанцёраў – пераважна выпускнікоў нашага факультэта[1]. У працы экспедыцыі ў 2018 г. прыняла ўдзел адкрывальніца помніка Г. М. Бяліцкая[2].

**Лакалізацыя помніка.** Селішча знаходзіцца на адлегласці каля 150–250 м на ўсход ад в. Яскавічы, на правым беразе р. Морачы – прытоку р. Случы – ва ўрочышчы Хутар Дзядкоў. Помнік месціцца на выгіне тэрасы, якая тут выразна паніжаецца – з 3–4 м да 1–1,5 м над поплавам. Поле, на якім размешчаны помнік, не разворваецца, яго паверхня задзернаваная, таму вызначыць памеры селішча складана. Папярэдне можна меркаваць, што плошча помніка складае каля 2,5 га. Сляды культурнага пласта адзначаюцца на ўсходзе на схіле тэрасы і палосай 80–100 м у шырыню цягнуцца ўздоўж ракі прыкладна на 250 м – да ўсходняга канца яе выгіну (мал. 2).




*Мал. 2.* Сітуацыйны план размяшчэння селішча каля в. Яскавічы
*Fig. 2.* Cituational plan of the settlement near the Jaskavičy village

[1]Кіраўніцтва практыкай ажыццяўлялі В. М. Сідаровіч, У. В. Грыб і В. Г. Белявец. Выказваю шчырую падзяку калегам за ўдзел у палявых даследаваннях, камеральнай апрацоўцы, а таксама вызначэнні матэрыялаў.

[2]Шчыра дзякую Г. М. Бяліцкай за перадачу правоў на вывучэнне гэтага помніка і той уклад, які яна ўнесла ў яго даследаванне ў 2018 г.

**Вынікі металаразведкі.** Помнік ужо дастаткова доўга рабуецца скарбашукальнікамі, таму перад пачаткам і на працягу даследаванняў 2018 г. на ім вяліся пошукавыя працы з дапамогай металадэтэктара[3]. У склад калекцыі быў уключаны 41 выраб. Гэтыя рэчы належаць да розных гарызонтаў помніка і прадстаўлены ў няроўных прапорцыях. Асноўную масу ўтвараюць знаходкі рымскага перыяду, Новага і Найноўшага часу – эпох, калі плошча помніка выкарыстоўвалася найбольш інтэнсіўна. Толькі асобнымі рэчамі прадстаўлены гарызонт Вялікага перасялення народаў і пачатку Ранняга сярэднявечча, якія пакуль не знаходзяць выразнага адлюстравання ў масавым матэрыяле. Ніжэй прадстаўлена толькі тая частка знаходак, якая мае непасрэднае дачыненне да тэмы артыкула, – знаходкі рымскага часу. Рэчы іншых эпох пакінуты для пазнейшага асобнага разгляду.

Папярэдне да гарызонту рымскага перыяду можна далучаць як мінімум 14 знаходак, адкрытых на помніку:

1) дынарый срэбны Рымскай імперыі (мал. 3, *а*: *1*), адбіты пры праўленні імператара Комада ў 183–184 гг. н. э.[4];

2) фібула падкавападобная са сплаву медзі ў двух фрагментах, літая, аздобленая эмалевымі ўстаўкамі (мал. 3, *а*: *2*). Абломкі часткова дэфармаваныя, магчыма, абпаленыя, іголка страчана. Дыяметр корпуса складаў каля 6,5 см, таўшчыня – 0,85 мм. Зверху ў яго цэнтры знаходзіцца гняздо выцягнутай трапецападобнай формы з малымі пляската-акруглымі выступамі на вуглах. У гняздзе захаваліся сляды эмалі белага колеру. На дне гнязда – нізкі літы *s*-падобна выгнуты выступ, які мог служыць для ўзмацнення эмалевага поля або, магчыма, дазваляў запаўняць гняздо шклом двух колераў. На канцах корпуса круглыя гнёзды з чырвонай эмаллю. Абводкі ўсіх трох гнёздаў аздоблены неглыбокімі насечкамі;

3) лунніца са сплаву медзі, літая, з эмалевымі ўстаўкамі (мал. 3, *а*: *3*). Шырыня – 4,5 см, вышыня – 2,6 см. Цела дугападобнае, з вялікім гняздом, якое паўтарае яго форму і запоўнена белай эмаллю. На канцах – акруглыя гнёзды з эмаллю чырвонага колеру. Ад кожнага з іх адыходзяць тры маленькія акруглыя выступы. На плечыках зверху – па адным акруглым выступе з адтулінамі. Унізе ад краёў цела па дыяганалі адыходзяць дзве планкі, пры злучэнні якіх знаходзіцца трохвугольны выступ;

4) фрагмент літай лунніцы са сплаву медзі з эмалямі (мал. 3, *а*: *4*). Уяўляе сабой абломак правага плечыка, верагодна, аналагічнай апісанай вышэй лунніцы. Захаваныя шырыня – 1,6 см, вышыня – 2,0 см. Цела дугападобна выгнутае, вузкае, з вялікім гняздом, якое паўтарае яго форму і было запоўнена белай (?) эмаллю, якая амаль цалкам выкрышылася. На канцы – акруглыя гнёзды з чырвонай эмаллю і трыма маленькімі акруглымі выступамі;

5) лунніца са сплаву медзі, літая, з эмалевымі ўстаўкамі (мал. 3, *а*: *5*). Вушка абламана каля асновы. Шырыня – 4,9 см, захаваная вышыня – 1,6 см. Цела падтрохвугольнай формы, слаба выгнутае, з проразямі на плечыках і акруглымі гнёздамі з белай эмаллю на канцах. Ад кожнага з гнёздаў адыходзяць па тры выступы трапецападобнай формы;

6) фрагментаваная літая лунніца са сплаву медзі, упрыгожаная эмалевымі ўстаўкамі (мал. 3, *а*: *6*). Тулава высокае падтрохвугольнае, выгнутае дугой, на плечыках – гнёзды з эмаллю чырвонага колеру. Вушка абламана, гнёзды на канцах страчаны. Захаваная вышыня – 2,1 см, шырыня – 3,1 см;

7) сякерападобная падвеска са сплаву медзі (мал. 3, *а*: *7*), высокая, з вузкім закругленым лязом. Вушка адламана. Захаваная вышыня – 2 см;

8) наканечнік рэменя са сплаву медзі (мал. 3, *а*: *8*), пласцінкавы, падоўжана-прамавугольнай формы, слаба завужаны пасярэдзіне, з прораззю ў верхняй частцы, дзе раменьчык мацаваўся з дапамогай, верагодна, дзвюх далікатных заклёпак, адна з якіх страчана. Ніжні канец арнаментаваны дзвюма тонкімі гравіраванымі лініямі, размешчанымі пад вуглом. Ніжні і верхні краі часткова вышчарбіліся. Захаваная даўжыня – 5,1 см, максімальная шырыня – 0,9 см, таўшчыня – 0,25 см;

9) пярсцёнак, скручаны з фрагмента бранзалета, са сплаву медзі (мал. 3, *а*: *9*). Зроблены з шырокай (10 мм) трохвугольнай у сячэнні стужкі, мае патоўшчаную прамавугольную пляцоўку на канцы. Арнаментаваны ўздоўж па грэбені парнымі наколамі;

10) фрагмент бранзалета (мал. 3, *а*: *10*). Зроблены з трохвугольнай у сячэнні стужкі, арнаментаваны ўздоўж па грэбені парнымі наколамі. Шырыня – 0,8 см, захаваная даўжыня – 2,7 см;

11) фрагмент паясной абоймы са сплаву медзі, верагодна, вонкавая палова (мал. 3, *а*: *11*). Шчыток мае трапецападобную форму з заклёпкай па цэнтры. Максімальная шырыня – 1,5 см, захаваная даўжыня – 2,8 см;

12) фрагмент паясной абоймы са сплаву медзі (мал. 3, *а*: *12*), палова, верагодна, унутраны бок. Шчыток мае падпрамавугольную форму з адтулінай пад заклёпку ў цэнтры. Максімальная шырыня – 1,2 см, захаваная даўжыня – 2,6 см;

13) фрагмент бранзалета (?) са сплаву медзі (мал. 3, *а*: *13*): арнаментаваная пласціна з шырокай пласціны трапецападобнай у сячэнні формы, упрыгожаная па краях ланцужкамі месяцападобных адбіткаў. Шырыня – 1,3 см, захаваная даўжыня – 1,9 см;

14) пранізка цыліндрычная, скручаная з бляхі са сплаву медзі (мал. 3, *а*: *14*). Даўжыня – 3,1 см, дыяметр – 0,5 см.

[3]Неацэнную дапамогу ў гэтых працах аказалі члены Салігорска-слуцкага аддзялення Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, якім выказваю шчырую падзяку.

[4]Дзякую за вызначэнне манеты В. М. Сідаровічу.




*Мал. 3.* Знаходкі з даследаванняў на селішчы Яскавічы-1 2018 г.: выяўленыя падчас разведкі (*а*):
*1* – дынарый Рымскай імперыі; *2* – фібула з эмалевымі ўстаўкамі; *3–6* – лунніцы і фрагменты лунніц з эмалевымі ўстаўкамі; *7* – сякерападобная падвеска; *8* – заканчэнне рэменя; *9* – пярсцёнак, скручаны з абломка бранзалета; *10* – фрагмент бранзалета; *11*, *12* – фрагменты паясных накладак; *13* – фрагмент бранзалета; *14* – пранізка; адкрытыя ў раскопе (*б*): *1* – фрагментаваны пінцэт; *2*, *3* – дэталі спражкі; *4* – фрагментаваная фібула; *5–15* – праселкі і іх абломкі; *16* – фрагмент тыгля;
(*а*: *1*, *б*: *4* – срэбра; *а*: *2–6* – сплаў медзі і шкло; *а*: *7–14*, *б*: *1–3* – сплавы медзі; *б*: *5–16* – гліна)

*Fig. 3.* Findings from researches on Jaskavičy settlement in 2018: found during the investigation (*a*):
*1* – denarius of the Roman Empire; *2* – fibula with enamel inserts; *3–6* – crescent and fragments crescent inserts with enamel; *7* – ax-like pendant; *8* – the end of the belt; *9* – ring stranded of the fragments of the bracelet; *10* – fragment of bracelet; *11*, *12* – fragments belt pads; *13* – fragment of bracelet; *14* – bronze plate bead;
found during excavation (*b*): *1* – fragmented tweezers; *2*, *3* – buckle detail; *4* – fragmented fibula; *5–15* – spindlewhorls and their fragments; *16* – a fragment of a crucible;
(*a*: *1*, *b*: *4* – silver; *a*: *2–6* – an alloy of copper and glass; *a*: *7–14*, *b*: *1–3* – copper alloys; *b*: *5–16* – clay)

Для праверкі кантэксту адной з найбольш цікавых знаходак – падковападобнай фібулы з эмалямі – у месцы яе адкрыцця, на ўсходнім краі селішча, закладзены шурф памерам 2×2 м. На месцы шурфоўкі пад дзірваном знаходзіўся ворны слой таўшчынёй да 0,27–0,30 м. На большай плошчы культурны пласт цягнуўся да глыбіні 0,45–0,50 м. Гэта быў гумусаваны пясок светла-карычневага колеру з попельна-вугальнымі ўключэннямі. На глыбіні 0,50 м залягаў аднародны светла-жоўты мацерыковы пясок. У шурфе знойдзены вялікі кавалак жужалю, 3 фрагменты сценак познеганчарнага шэрага посуду і 29 абломкаў сценак гладкасценных ляпных гаршкоў. Па характарыстыках фрагменты ляпнога посуду аналагічныя посуду жалезнага веку, адкрытаму ў раскопе.

**Задачы і методыка раскопак.** Даследаванні 2018 г. павінны былі вырашыць дзве асноўныя задачы: ацаніць захаванасць культурнага пласта і археалагічных аб’ектаў на розных участках помніка і вызначыць на рэпрэзентатыўным участку яго стратыграфію. У сувязі з гэтым працы вяліся вузкім раскопам (6–8 м у шырыню), размешчаным упоперак тэрасы, па лініі поўнач – поўдзень: ад паўночнага краю і далей у глыб тэрасы (гл. мал. 2, мал. 4). Паколькі Г. М. Бяліцкая не закончыла даследаванне жытла 1, раскоп быў разбіты такім чынам, каб завяршыць гэтыя працы: шурф 2017 г. быў цалкам уключаны ў аб’ём раскопу. У далейшым апошні паступова пашыраўся, і яго канчатковая плошча склала 360 м$^2$.

На розных участках раскопу стратыграфія помніка дастаткова істотна адрознівалася. Па ўсёй плошчы пад дзірваном залягаў ворны слой магутнасцю 0,25–0,30 м. У цэнтральнай і паўночнай частках раскопу культурны пласт быў практычна цалкам разараны, і жоўты мацерыковы дробназярністы пясок месцамі праступаў непасрэдна пад воркай. На поўдні, вакол шурфа 2017 г., стратыграфія была больш складанай. Тут пласт аднароднага шэрага пяску, верагодна сфарміраваны як эолавымі працэсамі, так і воркай, дасягаў 0,40 м. Ніжэй, да глыбіні 0,75 м, залягаў незакрануты культурны пласт – цёмна-шэры, з бурым адценнем пясок, насычаны арганікай і вугольчыкамі. На ўзроўні 0,50–0,60 м ад паверхні ў ім назіраліся характэрныя рудаватыя плямы абпаленага пяску, фрагменты перапаленай драўніны і галля. Культурны пласт падсцілала праслойка светла-жоўтага дробназярністага пяску таўшчынёй 5–8 см. Вакол жытла 1 мацерыковы грунт уяўляў сабой чырванаваты суглінак з дамешкамі балотнай руды. Пад паўднёвай сценкай і на поўдзень ад жытла 1 пад культурным пластам залягаў слой чыстага рачнога пяску і асадкавай стужкавай гліны светла-шэрага колеру.

**Характарыстыка знаходак са слоя селішча.** У культурным пласце помніка выяўлены больш за 60 індывідуальных знаходак: вырабаў з металаў, шкла, гліны, каменю. Абсалютная большасць з іх, каля 50 адзінак, адпавядаюць прадстаўленым вышэй




*Мал. 4.* План раскопу з аб’ектамі, вывучанымі на селішчы Яскавічы-1: А’ – аб’ект, Ж – жытло

*Fig. 4.* Plan of the excavation with objects studied at Jaskavičy-1 settlement: A’ – object, Ж – house

матэрыялам, атрыманым падчас металаразведкі, і павінна звязвацца з рымскім часам.

У раскопе былі знойдзены 14 металічных рэчаў, іх фрагментаў і адходаў металургічнай вытворчасці. Сярод іх 4 дакладна могуць звязвацца з гарызонтам рымскага перыяду:

1) фрагмент (каля паловы) пінцэта са сплаву медзі (мал. 3, *б*: *1*): з вузкага сегментападобнага ў сячэнні прутка, які плаўна пашыраецца ўніз, заканчваючыся пляскатай лапаткай. Захаваная даўжыня – 4,1 см, максімальная шырыня – 1,1 см;

2) рамка ад бронзавай спражкі (мал. 3, *б*: *2*). Знойдзена ў паўднёвай частцы раскопу ў другім пласце, каля 0,26–0,29 м ад паверхні. Рамка літая, кроплепадобнай формы, акруглая ў папярочным сячэнні. Нязначна патоўшчана ў пярэдняй, шырокай, частцы, мае выразныя сляды зношанасці ў месцы мацавання язычка;

3) язычок ад спражкі з бронзавага дроту (мал. 3, *б*: *3*): падтрохвугольны ў сячэнні, загнуты на адным канцы і раскляпаны на другім. Сцёрты ў месцы, дзе прылягаў да рамкі. Адпавядае памерам апісанай вышэй рамкі, знойдзены на адлегласці каля 25 см ад яе на тым жа стратыграфічным узроўні і, верагодна, паходзіць ад яе;

4) фрагмент срэбнай падвязной арбалетападобнай фібулы (мал. 3, *б*: *4*). Адкрыты ў паўднёвай частцы раскопу на глыбіні 0,38–0,40 м ад паверхні. Фрагмент мае каленчата выгнутую спінку з абламаным плечыкам спружыны (3 віткі) ад арбалетападобнай фібулы, блізкай да 162-га тыпу паводле класіфікацыі О. Альмгрэна. Спінка трохвугольная ў сячэнні, з пляцоўкамі ў аснове і на канцы. Спружына і падвязка ножкі з далікатнага прамавугольнага ў сячэнні дроту.

Вырабы з жалеза нешматлікія: 5 адзінак знойдзены бліжэй да паўночнага краю раскопу. Усе яны фрагментаваныя, толькі адзін выраб паддаецца вызначэнню – невялікі абломак нажа. У паўночнай частцы раскопу ў культурным пласце знойдзены 5 маленькіх кропель сплаву медзі.

**Керамічныя вырабы.** Найбольш шматлікую групу сярод індывідуальных знаходак утвараюць праселкі і абломкі другасна абпаленых мініяцюрных пасудзін, якія папярэдне могуць быць інтэрпрэтаваны як фрагменты металургічных тыгляў і льячак.

У раскопе знойдзены два цэлыя праселкі і 18 іх фрагментаў. Агульнай рысай гэтых знаходак з'яўляецца малая вышыня і шырокая адтуліна. Дыяметр цэлых экзэмпляраў і абломкаў, памеры якіх магчыма ўзнавіць, вагаецца паміж 2,8–3,3 см, іх вышыня складае ад 0,9 да 1,6 см, дыяметр адтулін – 1,5–1,7 см. Вылучаюцца тры асноўныя формы: біканічныя праселкі – 9 экзэмпляраў (мал. 3, *б*: *5–10*), бачонкападобныя – 3 (мал. 3, *б*: *11*, *12*), нізкай падцыліндрычнай формы – 8 (мал. 3, *б*: *13–15*). Сярод праселак кожнага з тыпаў ёсць экзэмпляры, адна ці абедзве плоскасці якіх больш або менш выразна ўвагнуты ўнутр або нахілены да адтуліны (мал. 3, *б*: *6*, *9*, *11*, *14*). Большасць вызначаецца старannай лепкай, паверхні выраўненыя, а ў некаторых – падлошчаныя. Маюць розныя адценні пясочнага, светла-карычневага і светла-шэрага колеру. Сустракаюцца асобныя чарналошчаныя фрагменты (мал. 3, *б*: *11*, *12*). У абсалютнай масе знаходкі неарнаментаваныя. Адзіным выключэннем з'яўляецца абломак нізкага праселка цыліндрычнай формы, знешняму абводу якога папярочнымі ўціскaннямі нададзена лёгкая хвалістасць (мал. 3, *б*: *15*).

Знойдзены 19 фрагментаў тыгляў – абломкаў керамічных пасудзін, якія характарызуюцца выразнымі слядамі высокатэмпературнага абпалу вонкавай паверхні, на якой утварылася бугрыстая шклістая корка. Унутры яны абпалены значна слабей. Найбольш выразныя фрагменты дазваляюць меркаваць, што гэта былі мініяцюрныя пасудзіны, у тым ліку з закругленым дном, дыяметр якіх па венцы не перавышаў 7–8 см (мал. 3, *б*: *16*). У планіграфіі абломкі тыгляў выразна канцэнтруюцца ўнутры і вакол пабудоў: жытла 1, большая частка якога была даследавана ў 2017 г., і жытла 2, вывучанага ў 2018 г.

У культурным пласце селішча ў 2018 г. таксама знойдзены два каменныя лашчылы, два абломкі шліфавальных плітак або адной пліты і фрагмент гліня-нага грузіка, верагодна, ад рыбацкай сеткі. Паколькі для іх не можа быць вызначана дакладнае датаванне, у гэтым артыкуле яны пакінуты па-за разглядам.

**Характарыстыка керамічнага комплексу.** З наяўных матэрыялаў не рэканструявана ніводная поўная форма. Тым не менш з улікам прафіліроўкі, спосабу апрацоўкі паверхні і арнаментацыі найбольш характэрных абломкаў сярод іх можна вылучыць групы посуду, якія адлюстроўваюць існаванне на помніку некалькіх гісторыка-культурных гарызонтаў.

Посуд эпохі неаліту – бронзы прадстаўлены пяццю-шасцю фрагментамі сценак. Папярэдне гэты гарызонт на падставе асобных характэрных крамянёвых вырабаў можа быць суаднесены пераважна з насельніцтвам тшцінецкай культуры[5]. Асобнымі абломкамі прадстаўлены і посуд ранняга жалезнага веку – мілаградскай культуры. Знойдзены два выразныя фрагменты гаршкоў гэтай культуры з прамымі, адагнутымі вонкі шыйкамі. Адзін з іх пакрыты звонку неглыбокай шчыльнай штрыхоўкай, гладкі з унутранага боку, упрыгожаны пад венцам трыма прадаўленымі знутры «пярлінамі». Другі гаршчок знойдзены ў запаўненні жытла 2 (аб'ект 7): ён старанна выраўнены і загладжаны з абодвух бакоў, таксама мае «пярліны» пад краем венца (мал. 5, *б*: *10*). Магчыма, з фіналам мілаградскага гарызонту звязаны абломак лошчанай пасудзіны цёмна-шэрага колеру, верагодна міскі, з патоўшчаным

[5]Дзякую У. В. Грыбу за вызначэнне вырабаў і адходаў крамянёвай вытворчасці, а таксама за кансультацыі па фрагментах посуду неаліту і бронзавага веку.

*а/a*




*Мал. 5.* План, профіль жытла 2 (*а*); знаходкі з жытла 2 (*б*):
*1* – колца са сплаву медзі; *2* – глінянае праселка; *3* – абломак глінянага тыгля; *4–9* – фрагменты ляпнога глінянага посуду

*Fig. 5.* Plan, profile of the house 2 (*a*); finds from the house 2 (*b*):
*1* – ring of copper alloy; *2* – clay spindlewhorl; *3* – chip of clay crucible; *4–9* – fragments of hand-made clay pottery

і падгранёным (?) венцам (мал. 6: *6*). Апошняя рыса характэрная для кола латэнізаваных культур Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і ў кантэксце помніка можа суадносіцца са з'яўленнем у цэнтральным Палессі на рубяжы III–II стст. да н. э. насельніцтва зарубінецкай культуры.

**Посуд рымскага перыяду.** Асноўную масу фрагментаў ляпнога посуду трэба аднесці да рымскага часу. Да магчымасцей больш дакладнага вызначэння храналогіі гэтага гарызонту вернемся ніжэй на падставе аналізу металічных вырабаў.

У першасным падзеле ў матэрыялах селішча Яскавічы-1 вылучаюцца дзве асноўныя катэгорыі посуду: кухонны і сталовы. У матэрыялах 2018 г. не адзначаны абломкі тарных пасудзін – вялікіх ёмістасцей кшталту карчаг, якія выкарыстоўваліся пераважна для захоўвання сыпучых і вадкіх рэчываў.

З ліку каля 3100 абломкаў ляпнога посуду, знойдзеных у культурным пласце, характар апрацоўкі паверхні вызначаецца для 1985 адзінак. Яны падзяляюцца на 5 груп: гладкасценны (не апрацаваны дадаткова), лошчаны, храпаваты, а таксама пакрыты штрыхоўкай і расчэсамі посуд. Размеркаванне фрагментаў ляпнога посуду з рознай апрацоўкай паверхні па пластах прадстаўлена ў выглядзе табліцы.

**Размеркаванне ляпнога посуду з рознымі спосабамі апрацоўкі паверхні па пластах**

**Distribution molded tableware with various surface treatment of the layers**

| Пласт | Тып посуду | | | | | | | | | | Усяго посуду ў пласце | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Гладкасценны | | Штрыхаваны | | Пакрыты расчэсамі | | Лошчаны | | Храпаваты | | | |
| | Колькасць | Доля, % | Колькасць | Доля, % | Колькасць | Доля, % | Колькасць | Доля, % | Колькасць | Доля, % | Колькасць | Доля, % |
| 1-ы | 783 | 90,2 | 54 | 6,2 | 2 | 0,2 | 29 (10 чорных) | 3,3 | – | – | 868 | 100 |
| 2-гі | 392 | 84,8 | 32 | 7,0 | 3 | 0,6 | 32 (22 чорныя) | 7,0 | 3 | 0,6 | 462 | 100 |
| 3-ці | 375 | 89,3 | 27 | 6,5 | 1 | 0,2 | 15 (усе чорныя) | 3,5 | 2 | 0,5 | 420 | 100 |
| 4-ы | 203 | 86,4 | 14 | 6,0 | – | – | 16 (6 чорных) | 6,8 | 2 | 0,8 | 235 | 100 |
| Усяго/Доля ў агульнай колькасці | 1753 | 88,5 | 127 | 6,4 | 6 | 0,3 | 92 (53 чорныя) | 4,6 | 7 | 0,2 | 1985 | 100 |

З прыведзеных даных вынікае, што асноўную масу посуду рымскага перыяду ўтвараюць абломкі гладкасценных пасудзін з неапрацаванай дадаткова паверхняй. Другую, значна меншую па колькасці групу складаюць фрагменты посуду са штрыхоўкай на вонкавым баку або на абодвух баках. Паверхня 92 абломкаў была больш або менш старанна залошчаная. Найменшую па колькасці групу складаюць фрагменты з расчэсамі. Абломкі посуду з розным характарам апрацоўкі паверхні размяркоўваюцца па пластах прыкладна ў аднолькавых прапорцыях. Доля гладкасценнага посуду складае 85–90 %, штрыхаванага – 6–7, лошчанага – 3–7 %. Удзельная вага абломкаў храпаватага і пакрытага расчэсамі посуду знаходзяцца ў межах статыстычнай памылкі, а фрагменты з расчэсамі не сустрэты ў 4-м, перадмацерыковым пласце, які выступаў толькі вакол жытла 1.

Абсалютная маса атрыманых фрагментаў паходзяць ад кухоннага посуду – гаршкоў сярэдніх памераў з розным спосабам апрацоўкі паверхні. У гэтай групе выразна пераважае гладкасценны посуд – адзінкі з больш або менш старанна выраўненай, не апрацаванай дадаткова паверхняй. На падставе назіранняў можна вызначыць, што ў якасці асноўнага дамешку выкарыстоўвалася жарства – гранітная крошка белага і чырвонага, радзей шэрага колеру. Магчыма, у гліняную масу таксама ўводзіліся тоўчаная жалезная руда і пясок. Доля дамешкаў вельмі значная – даходзіць да 25 % аб'ёму цеста. Памер зярнят жарствы вагаецца ад 2–3 да 10–13 мм у папярочніку. Таўшчыня сценак у сярэднім складае 7–9 мм, максімальная – 20–23 мм. На большасці донцаў знізу бачныя сляды пясчанай падсыпкі. Яны характарызуюцца выразна абазначаным пераходам да сценак (мал. 7: *6*, мал. 8: *12*, *16*, *19*, *20*). Шэраг донцаў таксама маюць выступы на вонкавы бок, так званыя пяткі (мал. 8: *13*, *14*, *17*, *18*), што ўказвае на выкарыстанне доннага і доннаёмістага начынаў. Калі меркаваць па зломах сценак, пераважна выкарыстоўвалася лепка глінянымі валікамі ці стужкамі. Кераміка мае розны колер: ад жаўтаватага, пясочнага, крэмавага і рудаватага да розных адценняў карычневага. Радзей, як правіла знутры, колер посуду вагаецца ад цёмна-шэрага да чорнага. Часцей за ўсё кераміка мае якасны і роўны




*Мал. 6.* Фрагменты ляпнога глінянага посуду з даследаванняў 2018 г. на селішчы Яскавічы-1: глянцаванага (*1–12*), храпаватага (*14*, *18*, *20*, *21*), са штрыхоўкай і храпаватасцю (*15*, *17*), расчэсамі (*13*, *16*, *19*)

*Fig. 6.* Fragments of the hand-made pottery from the research on Jaskavičy-1 settlement, 2018: polished (*1–12*), engobe (*14*, *18*, *20*, *21*), with hatching and engobe (*15*, *17*), scratching (*13*, *16*, *19*)

абпал, але адзначаюцца таксама плямістыя абломкі з рэзкім перападам афарбоўкі. Такім чынам, абпал адбываўся, верагодна, як у акісляльным, так і ва ўзнаўляльным газавым асяроддзі.

У абсалютнай большасці абломкаў гладкасценнага посуду паверхня больш роўная звонку, а ўнутраны бок апрацоўваўся менш якасна: часта ён бугрысты ці шурпаты, паколькі на ім выступае жарства.

Зараўноўванне паверхні адбывалася пераважна пасля вылепкі пасудзін. Радзей вонкавая паверхня разраўноўвалася ў працэсе лепкі, яшчэ будучы пластычнай, і на ёй з'яўляліся глыбокія, выразныя сляды загладжвання. Гэта сляды працы спецыяльным інструментам кшталту лапаткі (мал. 9: *4*, *7*) ці баразёнкі ад вертыкальных пацягненняў пальцамі (мал. 8: *8*, *12*). На шэрагу фрагментаў бачныя сляды змочвання, а часам – ангабіравання вадкай глінай, пасля якога на паверхні заставаліся характэрныя хвалістыя рагі (мал. 6: *20*). Ангоб таксама выраўноўваўся пацягваннямі пальцаў у пэўным кірунку: гарызантальна (мал. 7: *5*), вертыкальна (мал. 7: *4*) або ў розных напрамках, напрыклад гарызантальнымі пацягваннямі па максімальным пашырэнні тулава і вертыкальна па астатняй паверхні (мал. 8: *1*), чым таксама дасягаўся пэўны эстэтычны эфект. Без спецыяльных даследаванняў цяжка ацаніць, наколькі распаўсюджана было ангабіраванне пры фінальнай даводцы паверхні. Характэрныя трэшчынкі і сколы, якія назіраюцца на шэрагу абломкаў (мал. 8: *2*, мал. 9: *18*), сведчаць пра тое, што ангоб выкарыстоўваўся шырэй, чым можна меркаваць толькі на падставе слядоў яго разгладжвання.

Другім паводле распаўсюджанасці спосабам даводкі паверхні кухоннага посуду з'яўляецца штрыхаванне – апрацоўка з дапамогай пучкоў раслінных валокнаў. Як сведчыць адзін з апісаных вышэй абломкаў мілаградскага гаршка, частка посуду са штрыхоўкай можа належаць да ранняга жалезнага веку. Але знаходкі, якія можна ўпэўнена аднесці да гэтай эпохі, адзінкавыя, таму доля штрыхаванага посуду ў гарызонце рымскага часу не павінна істотна скараціцца – яна складае каля 6–7 %.

Штрыхоўка наносілася пераважна на вонкавую, радзей на ўнутраную паверхню гаршкоў (5 абломкаў) (мал. 9: *30*). Адзначаюцца таксама чатыры выпадкі штрыхавання з абодвух бакоў. Калі такім чы-




*Мал. 7.* Фрагменты ляпнога глінянага посуду з даследаванняў 2018 г. на селішчы Яскавічы-1 (*1*–*7*)
*Fig. 7.* Fragments of the hand-made clay pottery from the research on Jaskavičy-1 settlement, 2018 (*1*–*7*)




*Мал. 8.* Фрагменты сценак і донцаў ляпнога глінянага посуду з даследаванняў 2018 г. на селішчы Яскавічы-1 (*1–21*)
*Fig. 8.* Fragments of the wall and bottom of hand-made pottery from the research on Jaskavičy-1 settlement, 2018 (*1–21*)

нам апрацоўваўся ўнутраны бок, штрыхі, як правіла, наносіліся гарызантальна. Спосабы штрыхавання маразнастайныя. Пераважае шырокая рэгулярная, вертыкальная або слаба нахіленая штрыхоўка, якая шчыльна пакрывае паверхню (мал. 8: *5*, *10*, мал. 10: *1*, *6*, *11*, *16*), і штрыхаванне з вузкімі баразнамі (мал. 10: *17*). Радзей сустракаецца гарызантальная штрыхоўка (мал. 10: *3*, *7*, *9*, *14*). Напрамак штрыхоў можа быць адметным на розных частках адной пасудзіны, напрыклад, гарызантальныя штрыхі па максімальным пашырэнні тулава і вертыкальныя вышэй (мал. 10: *12*). На шэрагу фрагментаў штрыхі пакрываюць толькі тулава, а шыйка гладкая (мал. 7: *1*, мал. 10: *10*, *15*). Выразную групу ўтвараюць і фрагменты, на якіх штрыхаванне выступае ў рэдукаванай форме (у выглядзе рэдкіх шырокіх і глыбокіх



*Мал. 9.* Шыйкі гладкасценных ляпных пасудзін з даследаванняў 2018 г. на селішчы Яскавічы-1 (*1–32*)
*Fig. 9.* Necks of hand-made vessels with smooth wall from the studies at Jaskavičy-1 settlement, 2018 (*1–32*)

барознаў (мал. 10: *8*), неглыбокіх, шчыльна размешчаных штрыхоў (мал. 8: *9,* мал. 10: *2*, *15*)), а таксама фрагменты, на якіх штрыхоўка была пазней загладжана (мал. 7: *3*, мал. 10: *4*) ці схавана пад слоем храпаватасці (мал. 6: *17*, *18*).

Знойдзена ўсяго 7–8 фрагментаў храпаватага посуду – адно донца і сценкі, прычым пры іх вырабе выкарыстаны вельмі розныя тэхнікі храпавачэння. У двух выпадках у яшчэ пластычную паверхню пасудзін была ўцёрта вялікая колькасць дробнай жарствы і пяску, у выніку чаго яна набыла шурпатасць (мал. 6: *14*, *15*). Адзін абломак пакрыты пластычным ангобам паверх неглыбокай рэгулярнай вертыкальнай штрыхоўкі (мал. 6: *17*), а другі – храпаваты звонку, але з унутранага боку пакрыты штрыхоўкай. Астатнія маюць «класічнае» ў цэнтральнаеўрапейскім разуменні гэтай тэхнікі храпавачэнне: пластычным ангобам па гладкай паверхні (мал. 6: *18*, *21*).

Апошнім, найменш распаўсюджаным прыёмам апрацоўкі паверхні грубаляпнога посуду з’яўляюцца




*Мал. 10.* Фрагменты ляпнога глінянага посуду са штрыхоўкай з даследаванняў 2018 г. на селішчы Яскавічы-1 (*1–17*)
*Fig. 10.* Fragments of the hand-made pottery with hatching from the research on Jaskavičy-1 settlement, 2018 (*1–17*)

расчэсы (гл. табліцу). Наносіліся яны толькі звонку. Гэты спосаб баразнаватага загладжвання выкананы адмысловым штампам або фрагментамі грабеньчыкаў з рога ці дрэва. Вузкія рэгулярныя паралельныя баразны шчыльна пакрываюць паверхню (мал. 6: *13*, *19*) або крыжуюцца пад вуглом, утвараючы ўзор накшталт косай сеткі (мал. 6: *16*).

Стандартным прыёмам арнаментацыі гаршкоў з'яўляюцца косыя адзінарныя, часам двайныя ці рознанакіраваныя насечкі і ўціскание па зрэзе і вонкавым краі венцаў. Такім чынам упрыгожвалася каля дзвюх трэціх пасудзін. Зрэдку адзначаюцца іншыя спосабы арнаментацыі: двайнымі «шахматнымі» зашчыпамі (мал. 9: *15*), уціскannямі паабапал венца, якія надаюць яму хвалістую форму (мал. 10: *13*), або штрыхоўкай па зрэзе венца (мал. 10: *1*, *2*). Тулавы кухонных гаршкоў, як правіла, не ўпрыгожваліся. У адзінкавых выпадках арнамент адзначаецца на тулавах гладкасценнага посуду: гэта пальцавыя парныя (мал. 8: *2*) і пазногцевыя ўціскanні (мал. 8: *3*)

або пракрэсленыя баразёнкі, якія ўтвараюць косую сетку на шыйцы (мал. 8: *6*). Адзначаецца пэўная тэндэнцыя: арнамент часцей выступае на штрыхаваным посудзе ў выглядзе гарызантальных ланцужкоў з насечак і пальцавых уціскванняў па плечыку (мал. 8: *5*, *9*, *10*).

На падставе аналізу выразных фрагментаў керамікі можна меркаваць, што найбольш пашыранай формай кухоннага посуду былі гаршкі сярэдніх памераў з дыяметрам па венцы каля 15–25 см і максімальным пашырэннем тулава прыблізна на дзве трэція вышыні пасудзіны (мал. 7: *1*, *3–5*; мал. 10: *5*, *8*). Радзей адзначаецца больш высокае размяшчэнне плечыка – каля трох чацвёртых ці вышэй (мал. 7: *7*, мал. 9: *24*). Абсалютна пераважаюць фрагменты акруглабокіх гаршкоў (мал. 7: *1*, *3–5*, мал. 8: *1*, *3*, *5*, *9*, *10*, мал. 10: *5*). Абломкі з акцэнтаваным плечыкам або тыя, якія можна вызначыць як рабрыстыя, адзінкавыя (мал. 7: *7*, мал. 8: *7*, *11*, *15*).

Прафіліроўка верхніх частак дэманструе найперш нехарактэрнасць так званых раскрытых форм: дыяметр па венцы гаршкоў роўны максімальнаму пашырэнню тулава ці меншы за яго.

Самую нешматлікую групу ўтвараюць абломкі слікападобных гаршкоў без вылучанай шыйкі (мал. 7: *2*, мал. 9: *1*, *2*). Аднолькава рэдка сустракаюцца фрагменты з выразна абазначанай, акцэнтаванай верхняй часткай (з прамой канічнай (мал. 7: *1*), кароткай прамой адагнутай вонкі шыйкай (мал. 9: *6*, *7*)) і з акцэнтаваным праз выразнае патаўшчэнне ці адмысловае прафіляванне венцам (мал. 9: *11–13*). Часцей адзначаецца вельмі выразны, але плаўны выгін шыек (мал. 9: *15*, *19*, *24*, *29*). Пераважае плаўнае афармленне верхніх частак гаршкоў. Іх шыйкі могуць істотна адрознівацца паводле нахілу. Найменш распаўсюджаны нахіленыя ўнутр шыйкі з ледзь абазначаным венцам (мал. 9: *3–5*, *18*).

Шырэй прадстаўлены абломкі гаршкоў з вертыкальнымі кароткімі шыйкамі (мал. 9: *16*, *17*, *20*, *21*, *25*). Абсалютная ж маса мае больш або менш выразны выгін (мал. 7: *4*, *5*, мал. 9: *22–24*, *26–28*, *30–32*, мал. 10: *4–10*). Частка венцаў афармлялася зрэзамі, як правіла, звонку (мал. 9: *9*, *26*, *27*).

Сталовы посуд прадстаўлены фрагментамі мініяцюрных пасудзін, місак і (або) гаршчочкаў. Ён адрозніваецца спосабамі апрацоўкі паверхні: сустракаецца як грубаляпны, так і лошчаны. Да гладкасценнага сталовага посуду можна аднесці абломкі дзвюх пасудзін, верагодна місак, з выразна абазначаным рабром (мал. 8: *11*, *15*), донца мініяцюрнай пасудзіны, верагодна кубачка (мал. 8: *21*), а таксама фрагмент верхняй часткі гаршчочка або кубка з неглыбокай шчыльнай штрыхоўкай ніжэй адхіленай вонкі шыйкі (мал. 10: *15*).

Да сталовага посуду таксама трэба аднесці абломкі лошчаных вырабаў, якія займаюць да 5 % у агульнай колькасці. Іх цеста вызначаецца дамешкамі меншага памеру. Па колеры і, адпаведна, спосабе абпалу лошчаны посуд падзяляецца на дзве прыкладна роўныя разнавіднасці: вырабы розных адценняў карычневага колеру і цёмна-шэрыя або чарналошчаныя. Сярод найбольш выразных абломкаў сталовага посуду серыяй прадстаўлены фрагменты чарналошчаных пасудзін сярэдніх памераў з нахіленымі ўнутр шыйкамі – місак і (або) невялікіх гаршкоў (мал. 6: *1–3*) – і абломкі мініяцюрнага гаршка (мал. 6: *4*). Рэканструюецца таксама большая частка чорнаглянцаванага кубачка з разгорнутай прамой шыйкай (мал. 6: *5*), блізкага па форме да згаданага вышэй штрыхаванага кубка (мал. 10: *15*). Адзін з фрагментаў сценкі лошчанай пасудзіны з’яўляецца прыкладам арнаментальнай кампазіцыі з вертыкальнай зігзагападобнай лініі і месяцападобных адбіткаў пазногця (мал. 8: *4*). Выраб шэрага колеру, яго ўнутраная паверхня выраўнена пацягваннямі пальцаў, а знешняя пакрыта ангобам і падлошчана. Ангоб з часам часткова адпаў і раскрышыўся, знішчыўшы арнамент.

## Вынікі даследавання аб'ектаў

Пасля зняцця культурнага слоя на ўзроўні 2-га пласта на поўначы і сярэдняй часткі раскопу ды 4-га пласта на поўдні на фоне светла-жоўтага мацерыковага пяску праявіліся контуры аб’ектаў. Нумарацыя ім надавалася па меры адкрыцця, але разгледзім іх зыходзячы з лакалізацыі ў межах раскопу, пачынаючы з поўдня (гл. мал. 4).

У паўднёвай частцы раскопу аб’екты групаваліся вакол пабудовы, большая частка якой была вывучана ў 2017 г., – вакол жытла 1 (гл. мал. 4, А’5, А’6, А’8–А’10). У 2018 г. даследаванне гэтага аб’екта было завершана.

**Жытло 1.** Вакол шурфа Г. М. Бяліцкай у 2017 г. былі расчышчаны заходні, паўднёвы і ўсходні ўскрайкі жытла (мал. 11). У даследаванай у 2018 г. частцы яно было нязначна заглыблена ў мацярык – на 3–5 см. Запаўненне жытла практычна не вылучалася ў культурным пласце. Яго контуры праявіліся толькі ў прыдоннай партыі цямнейшым колерам і канцэнтрацыяй знаходак. Падсумоўваючы вынікі прац 2017–2018 гг. (гл. [31]), можна вызначыць, што жытло мела прамавугольную форму, яго памер складае прыблізна 4,7 × 4,0 м. Яно было арыентавана доўгімі бакамі па лініі захад – усход з нязначным, у 3–4°, адхіленнем да паўночнага ўсходу. Паколькі па перыметры пабудовы і ў яе аб’ёме не выяўлена ям, якія маглі б утвараць сістэму апорных слупоў, жытло павінна было мець зрубную канструкцыю. Яго максімальная глыбіня складала каля 0,45–0,55 м ад сучаснай паверхні. Жытло перакрыла вялікую яму авальнай формы, якая залягала пад яго паўднёвай сценкай (гл. ніжэй апісанне аб’екта 8), і выразна чыталася з глыбіні 0,55–0,60 м ад сучаснай паверхні.




*Мал. 11.* Аб'екты ў паўднёвай частцы раскопу на ўзроўні зачысткі мацерыка. Селішча Яскавічы-1, 2018 г. (А' – аб'ект)

*Fig. 11.* Objects in the southern part of the excavation at the level of the base stripping. Jaskavičy-1 settlement, 2018 (A' – object)

У 2018 г. у межах пабудовы знойдзена адна дробная закатаная кальцыніраваная костка і 31 абломак ляпнога глінянага посуду: 2 шыйкі, 3 донцы, 26 сценак (усе яны паходзяць ад гаршкоў). З іх 22 фрагменты гладкасценныя. Нестандартнай дэталлю вылучаецца адзін з абломкаў верхняй часткі гаршка са слаба выгнутай, амаль вертыкальнай шыйкай з насечкамі па краі: яе аснова падкрэслена гарызантальнай баразёнкай (мал. 12, а: *1*). Яшчэ 9 абломкаў звонку пакрыты штрыхоўкай рознага характару: ад шырокай неглыбокай (мал. 12, *а*: *2*) або адмыслова зацёртай штрыхоўкі да глыбокіх барознаў, якія шчыльна пакрываюць паверхню (мал. 12, *а*: *3*). Марфалагічна найбольш выразным з'яўляецца абломак шыйкі штрыхаванага гаршка з кароткім вертыкальным венцам, упрыгожаным насечкамі (мал. 12, *а*: *2*).

**Агмень 3 з жытла 1** (мал. 12, *б*). У 2018 г. каля ўсходняй сценкі жытла была расчышчана частка аб'екта, вывучэнне якога распачала Г. М. Бяліцкая, інтэрпрэтаваўшы яго як выбрукоўку [31, с. 568]. Ён быў размешчаны ў культурным пласце прыдоннай часткі жытла, пасярэдзіне яго ўсходняй сценкі. У раскопе 2018 г. яго план быў расчышчаны на глыбіні каля 0,40–0,43 м ад паверхні. На фоне культурнага пласта аб'ект вызначаўся наяўнасцю палявых камянёў да 15 см у папярочніку, абломкаў глінянай абмазкі і канцэнтрацыяй фрагментаў посуду. Ён меў памеры прыкладна 0,58–0,60 × 0,50–0,53 м, быў выцягнуты па лініі захад – усход. Такім чынам, з улікам даследаванай у 2017 г. часткі аб'ект меў авальную форму памерамі каля 1,2 × 0,5 м. Унутры і вакол яго грунт быў перамешаны з попелам і вуголлем, камяні і абмазка абпаленыя. Па наяўнасці попельна-вугальных уключэнняў у культурным пласце можна меркаваць, што яго глыбіня не перавышала 10 см ад узроўню зачысткі. Нягледзячы на адсутнасць выразных канструктыўных дэталей, гэты аб'ект можа інтэрпрэтавацца як сляды агменя, які, магчыма, быў разабраны гаспадарамі яшчэ ў час выкарыстання пабудовы.

У аб'екце знойдзены 34 фрагменты ляпнога глінянага посуду. Паводле спосабу апрацоўкі паверхні яны падзяляюцца ў прапорцыях, тыповых для культурнага слоя: адзін чарналошчаны (сценка), два штрыхаваныя (у тым ліку фрагмент шыйкі); рэшта паходзіць ад гладкасценных кухонных гаршкоў. Сярод марфалагічна найбольш выразных можна адзначыць верхнія часткі гаршкоў з плаўным *s*-падобным выгінам шыек (мал. 12, *б*: *1*). Адзін з іх паходзіць ад гаршка, вонкавая паверхня якога па тулаве і нізе шыйкі пакрыта шчыльнай неглыбокай штрыхоўкай (мал.12, *б*: *2*).

Вакол жытла знойдзены канкрэцыі дзярновай жалезнай руды. Яны канцэнтраваліся ў межах своеасаблівага геалагічнага аб'екта: прапластка моцна гумусіраванага бурага грунту, перамяшанага з ліманітам. Прапластак выкліньваўся з усходняй сценкі і цягнуўся праз увесь раскоп, не даходзячы 40–50 см да яго заходняй сценкі. Пасярэдзіне, у месцы максімальнага расшырэння, яго шырыня складала каля 2 м, а паўночная частка ўваходзіла пад паўднёвую сценку жытла 1. Сячэнне гэтага прапластка атрымана ў броўцы, пакінутай па цэнтры раскопу (гл. мал. 11, А–А1). Прапластак пачынаўся непасрэдна пад ворным культурным слоем каля ўсходняй сценкі раскопу і плаўна паніжаўся да яго цэнтра, дзе яго таўшчыня дасягала 0,35–0,38 м. Яго падсцілаў пласт светла-шэрай стужкавай гліны. Верагодней за ўсё, утварыўся гэты прапластак у старажытным натуральным паніжэнні рэльефу, дзе ва ўмовах павышанай вільготнасці адбывалася фарміраванне ліманіту. У яго былі ўкапаны чатыры аб'екты – № 6, 8–10 (гл. мал. 11, А'6, А'8–А'10).

**Аб'ект 8.** У цэнтры прапластка знаходзіўся аб'ект 8 (мал. 11, А'8, А–А1). Ён быў расчышчаны на глыбіні каля 0,65 м і цягнуўся ўніз да 1,07–1,10 м ад паверхні помніка. У плане меў правільную выцягнутую форму, якая ў цэлым паўтарала форму насычанага рудой прапластка, але вылучаўся больш цёмным запаўненнем з вугольчыкамі і значнымі попельна-вугальнымі дамешкамі ў прыдоннай частцы, дзе вугаль залягаў уперамешку са збітай масай ліманіту. З улікам часткі, даследаванай у 2017 г., яго памеры складалі прыкладна 3,35 × 1,9 м. У заходняй частцы аб'екта 8 знойдзены фрагменты сківіцы буйной рагатай жывёлы або каня.

**Аб'ект 9** (мал. 11, А'9). Гэты аб'ект меў падобны, як у аб'екта 8, характар: гэта яма авальнай у плане формы памерам 1,65 × 0,85 м. Яна прасочана з глыбіні 0,80 м ад паверхні. Глыбіня аб'екта 9 ад узроўню зачысткі склала каля 0,30 м. Яма мела закругленыя да дна сценкі, была запоўнена моцна гумусіраваным грунтам з попельна-вугальнымі дамешкамі. Суцэльны попельна-вугальны слой цягнуўся па дне ямы, дзе рэшткі вогнішча былі перамешаны з ліманітам.

Аб'екты 6 і 10 (гл. мал. 11, А'6, А'10) прасочаны ў 3-м і 4-м пластах адпаведна. Мяркуючы па акруглай форме, памерах і сячэнні, яны ўяўляюць сабой ямы ад масіўных слупоў.

**Аб'ект 6.** Контур ямы праявіўся на поўдзень ад паўднёва-заходняга кута жытла 1, прыкладна на 0,60 м ніжэй сучаснай паверхні. Яма вылучалася на фоне цёмнага культурнага пласта светлым запаўненнем. Мела авальную ў плане форму, памер – 0,50 × 0,58 м. Была запоўнена светла-шэрым пяском, святлейшым да краёў, мела вертыкальныя сценкі і шырокае лінзападобнае пашырэнне ў прыдоннай частцы, якое ўзнікла, верагодна, у выніку размывання грунтавымі водамі. Максімальная глыбіня складае каля 1,05 м ад сучаснай паверхні. У запаўненні знойдзены 16 дробных расслоеных абломкаў сценак грубаляпных гліняных пасудзін з не апрацаванай дадаткова паверхняй.

**Аб'ект 10.** Контуры прасочаны на ўзроўні зачысткі мацерыка, каля 0,85 м ад сучаснай паверхні, каля




*Мал. 12.* Фрагменты ляпнога глінянага посуду з жытла 1 (*а*);
план, профіль і фрагменты ляпнога посуду з агменя 3 у жытле 1 (*б*); план і профіль аб’екта 5 (калодзеж) (*в*)

*Fig. 12.* Fragments of the hand-made pottery from the house 1 (*a*);
plan, profile and fragments of the hand-made pottery from the fireplace 3 in the house 1 (*b*);
plan, profile of the object 5 (a well) (*c*)

паўднёва-ўсходняга кута жытла 1. Яма мела авальную ў плане форму, памер – прыкладна 0,40 × 0,58 м. Яна была запоўнена аднародным цёмна-шэрым пяском. Мела слаба закругленыя ўніз сценкі і пляскатае дно. Максімальная глыбіня – каля 1,10 м ад паверхні.

**Аб'ект 5** (мал. 12, *б*). Контуры аб'екта праявіліся ў 4-м пласце на фоне больш цёмнага культурнага слоя. Ніжэй, на глыбіні каля 0,85 м, ён быў выразна бачны ў слоі асадкавай гліны і пяску. На гэтым узроўні яма мела акруглую форму, каля 0,85–0,90 м у дыяметры. Ніжэй на 7–8 см па яе цэнтры прасочаны контур спарахнелай канструкцыі з драўніны: квадратнай, з бакамі даўжынёй 0,50–0,58 м. З гэтага ўзроўню аб'ект даследаваўся сячэннем па дыяганалі драўлянай канструкцыі. У сячэнні яе рэшткі – вертыкальныя сценкі – былі прасочаны толькі на 8–10 см. Ніжэй у профілі аб'ект меў сегментападобную форму. Ён быў запоўнены светла-жоўтым пяском, які бліжэй да дна чаргаваўся з прапласткамі суглінку з дамешкамі буйназярністага пяску. На дне знойдзены малы зацёрты абломак сценкі ляпной глінянай пасудзіны.

Верагодна, аб'ект уяўляе сабой рэшткі калодзежа круглай формы дыяметрам каля 0,90 м, у цэнтры якога быў усталяваны драўляны кораб. Зафіксаваны ў профілі яго ўчастак з'яўляецца ніжняй часткай калодзежа, на ўзроўні грунтавых вод, дзе пясчаныя сценкі размываліся.

**Аб'ект 1.** Знаходзіўся ў сярэдняй частцы раскопу (мал. 4, А'1, мал. 13, *а*). План расчышчаны на глыбіні каля 0,45 м. Яма авальнай формы, 2,05 × 1,05 м, арыентавана па лініі поўнач – поўдзень з адхіленнем каля 5° да ўсходу. Мела сегментападобнае сячэнне і няроўнае дно. Максімальная глыбіня складала да 0,75 м ад сучаснай паверхні. Запаўненне ўтвараў пясок карычневага колеру з украпленнямі вуголля, больш светлы па краях і ў прыдоннай частцы. У заходняй частцы знойдзены два палявыя камяні каля 10 см у папярочніку, вакол якіх канцэнтраваліся вугалькі і пяць дробных абломкаў кальцыніраваных костак.

У верхняй частцы ямы, бліжэй да цэнтра, знойдзены тры абломкі верхняй часткі гаршка з плаўна выгнутай, нахіленай унутр шыйкай, упрыгожанай па знешнім краі венца насечкамі (мал. 13, *а*: *1*). Фрагменты пясочна-светла-карычневага колеру са светла-шэрымі плямамі. У цесце ёсць дамешкі чырвонай і белай жарствы да 7 мм у папярочніку. На ўнутранай паверхні – глыбокія гарызантальныя зацёртыя барозны. Шыйка звонку гладкая, а ў ніжняй частцы ў вільготную паверхню ўцёрты дробная жарства і пясок, магчыма разроўненыя вехцем з раслінных валокнаў.

**Аб'ект 2** (мал. 4, А'2; мал. 13, *б*). Месціўся ў сярэдняй частцы раскопу, на паўднёвы ўсход ад аб'екта 1. Контур прасочаны з глыбіні каля 0,47–0,50 м ад паверхні. У плане яма мела блізкую да квадратнай форму, была арыентавана вугламі амаль дакладна па баках свету. Памеры на ўзроўні зачысткі складалі прыкладна 0,75 × 0,75 м. Яма мела сегментападобнае сячэнне з закругленым няроўным дном. Максімальная глыбіня – каля 1,15 м ад паверхні. Была запоўнена карычневым пяском, перамешаным з попелам і вуголлем.

Пераважна ў прыдоннай частцы, бліжэй да цэнтра, знойдзены 14 абломкаў як мінімум ад дзвюх пасудзін: 3 сценкі, магчыма ад адной лошчанай пасудзіны светла-карычневага колеру, і 11 фрагментаў адной ці некалькіх гладкасценных пасудзін – 9 сценак і 2 донцы. На вонкавай паверхні аднаго з іх бачныя сляды ангабіравання са слядамі вертыкальнага загладжвання (мал. 13, *б*: *1*). Фрагменты пясочна-крэмавага колеру, з дамешкамі жарствы да 3 мм у папярочніку.

**Аб'ект 3 (пабудова 1)** (мал. 4, А'3: мал. 14). Верхнія партыі запаўнення аб'екта знішчаны воркай. На ўзроўні мацерыка мае форму, блізкую да прамавугольнай, памеры – каля 2,95–3,05 × 11,95 × 2,05 м. Аб'ект быў арыентаваны па лініі паўночны захад – паўднёвы ўсход з адхіленнем каля 5° да захаду. Даследаваны дыяганальным сячэннем. Запаўненне ўтвараў аднародны пясок светла-карычневага колеру. Дно пляскатае, вельмі нязначна – на 5–8 см – заглыбленае ў мацерыковы пясок. Глыбіня асноўнай часткі складала каля 0,55–0,58 м ад паверхні. У паўднёвым куце пабудовы прасочана круглая слупавая яма дыяметрам каля 0,20 м, заглыбленая ў мацерыковы пясок да 15 см. У заходняй частцы, па цэнтральнай восі аб'екта, знаходзілася квадратная яма памерам прыблізна 1,3 × 1,4 м, глыбінёй каля 0,55 м ад падлогі. Мела нахіленыя сценкі і няроўнае дно. Знаходкі ў яе запаўненні адсутнічалі.

Ва ўсходнім куце пабудовы знаходзілася яма круглай формы дыяметрам каля 0,60 м, якая прасочвалася з ворнага слоя і была заглыблена да 0,25–0,28 м ніжэй яе дна. Характар запаўнення і дакладнасць, з якой быў зроблены гэты ўкоп, указвае на тое, што ён, верагодней за ўсё, з'яўляецца нядаўняй скарбашукальніцкай ямай, выкапанай для здабыцця нейкага дастаткова масіўнага металічнага вырабу.

У пабудове знойдзены 25 фрагментаў ляпнога глінянага посуду, якія паходзяць як мінімум ад 4 гаршкоў: 4 шыйкі і 20 сценак. Адзін з абломкаў сценак пакрыты звонку шырокай рэгулярнай штрыхоўкай (мал. 14: *5*), рэшта – ад гладкасценнага посуду. Усе фрагменты пясочнага і светла-карычневага, бэжавага або рудаватага колеру, у цесце – дамешкі жарствы да 5–6 мм у папярочніку. Абломкі шыек паходзяць ад гаршкоў закрытых форм са слаба вылучанымі вертыкальнымі шыйкамі (мал. 14: *1–4*). Венца аднаго з іх упрыгожана далікатнымі парнымі ямкамі (мал. 14: *3*). Знешняя паверхня другога фрагмента выраўнена прыладай з няроўным працоўным краем, якая пакінула характэрныя глыбокія гарызантальныя баразёнкі (мал. 14: *1*).




*Мал. 13.* План, профіль аб’екта 1 і шыйка ляпнога глінянага гаршка з яго запаўнення (*а*);
план, профіль аб’екта 2 і донца ляпнога глінянага гаршка з яго запаўнення (*б*)

*Fig. 13.* Plan, profile of the object 1 and a neck of a hand-made clay pot from his filling (*a*);
plan, profile of the object 2 and a bottom of a hand-made clay pot from his filling (*b*)

Адносна невялікія памеры – каля 6 м$^2$ – і адсутнасць слядоў ацяпляльнага прыстасавання сведчаць пра тое, што гэта была гаспадарчая пабудова, верагодна, зрубнай канструкцыі. Слупавую яму ў паўднёвым куце трэба трактаваць як сляды рамонту або элемент інтэр'ера пабудовы.

**Аб'ект 7 (жытло 2)** (мал. 4, А'7, мал. 5). Аб'ект уяўляе сабой жытло са слупавой канструкцыяй сцен. Верхняя частка аб'екта знішчана воркай. Яго контуры праявіліся толькі ў доннай партыі на ўзроўні мацерыковага пяску: больш выразныя яны ў паўночнай частцы і амаль не прасочваліся на поўдні. Запаўненне ўтвараў светла-карычневы пясок. Паглыбленая ў мацярык частка мела падпрамавугольную форму, памеры – 4,2 × 5,3 м, сценкамі арыентавана па баках свету з адхіленнем 3–4° па лініі паўночны ўсход – паўднёвы захад. Профіль атрыманы ў прадольным сячэнні па восі поўнач – поўдзень (мал. 5, *а*, А–А1). Запаўненне захавалася да 0,17–0,20 м ад мацерыка, вельмі невыразна чыталася ўнізе. Верагодна, заглыбленая частка жытла ўяўляла сабой не катлаван, а, хутчэй, паўстала ў выніку затоптвання яго падлогі. Ад цэнтра ўсходняй сценкі, са зmяшчэннем да поўдня, прыкладна на 1,5 м адыходзіў выступ шырынёй да 2,2 м, – верагодна, утаптаны грунт на месцы ўваходу ў жытло. Па перыметры паглыбленай часткі расчышчаны сем слупавых ям ад 0,25–0,28 да 0,40 м у папярочніку глыбінёй 0,20–0,45 м ад мацерыковага ўзроўню. Па прадольнай восі пабудовы знаходзіліся тры масіўныя слупы, на якія абапіраўся двухсхільны дах (мал. 14, *а*, А–А1). Тры больш тонкія слупавыя ямы, адкрытыя ўздоўж усходняй сценкі, указваюць на тое, што пабудова мела шулавую канструкцыю сцен. Слупавая яма зафіксавана і ў паўночна-заходнім куце пабудовы. З поўдня ўдалося прасачыць толькі адну, вялікую, яму па цэнтры і ніводнай – з заходняга боку, дзе яны, верагодна, былі цалкам знішчаны.

У паўднёва-заходнім куце расчышчаны рэшткі агменя: выяўлены 11 палявых камянёў да 20 см у папярочніку, размешчаных па дузе з разрывам у бок цэнтра пабудовы. Сярод іх выступаў попел




*Мал. 14.* План, профіль аб'екта 3 (гаспадарчай пабудовы) (*а*); фрагменты ляпнога глінянага посуду з яго запаўнення (*б*) (*1–5*)

*Fig. 14.* Plan, profile of the object 3 (outbuilding) (*a*); fragments of the hand-made clay pottery from his filling (*b*) (*1–5*)

і вугольчыкі, а мацерыковы грунт пад імі нёс характэрныя рудаватыя сляды абпалу. У супрацьлеглым паўночна-ўсходнім куце знаходзіліся дзве авальныя ямы памерамі 1,10 × 60 і 1,30 × 0,45 м. Яны часткова перакрывалі адна адну і, верагодна, мелі гаспадарчае прызначэнне (мал. 5, *а*: *7*, *8*). Знаходкі ў ямах адсутнічалі. Яшчэ адна яма, абазначаная як аб'ект 4, знаходзілася па цэнтры паўночнай сценкі. Яна вызначалася больш цёмным запаўненнем. Няроўныя контур і дно могуць указваць на парушэнне карэннем або натуральнае паходжанне гэтага аб'екта (мал. 5, *а*: *2*).

У межах пабудовы, аконтуранай слупавымі ямамі (як у культурным пласце, вышэй прасочанай заглыбленай часткі, так і непасрэдна ў ёй) сабраны 9 індывідуальных знаходак. Яны выступалі на абмежаванай прасторы, толькі ў паўночна-заходняй частцы пабудовы – насупраць агменя і верагоднага ўваходу ў жытло:

1) колца са сплаву медзі (мал. 5, *б*: *1* і *а*: *1*), скручанае з круглага ў сячэнні дроту ў паўтара абароту, дыяметрам 1,4 см. На паверхні заўважаюцца выразныя сляды валачэння. Канцы абламаны неахайна, з завусеніцамі. Верагодна, колца было фрагментам больш доўгай аплёткі і магло з'яўляцца паўфабрыкатам ці сыравінай для іншых вырабаў;

2) глінянае праселка (мал. 5, *б*: *2* і *а*: *2*) крэмава-светла-шэрага колеру біканічнай формы з шырокай адтулінай, падлошчанае. Дыяметр праселка – 2,8 см, адтуліны – 1,4 см;

3) чатыры фрагменты металургічных тыгляў ці льячак – абломкі мініяцюрных гліняных пасудзін з характэрнай шклістай коркай звонку і менш выразнымі слядамі абпалу з унутранага боку. Найбольш выразны з іх дазваляе рэканструяваць тыгель у форме маленькай, дыяметрам каля 5,5–6 см, пасудзінкі з акруглым донцам і кароткай, трохвугольнай у сячэнні ручкай, якая адыходзіць ад яго венца (мал. 5, *б*: *3* і *а*: *3*);

4) кропля расплаўленага сплаву медзі (мал. 5, *а*: *4*);

5) два невызначальныя дробныя абломкі пласцінкавых жалезных вырабаў.

Вакол пабудовы былі знойдзены рэчы, якія таксама могуць быць звязаны з яе выкарыстаннем: аплаўлены фрагмент сценкі тыгля каля паўднёва-заходняга кута (мал. 5, *а*: *7*), скол з ашлакаванай вонкавай паверхні тыгля (мал. 5, *а*: *5*) і фрагмент апісанага вышэй пінцэта са сплаву медзі, знойдзеныя каля ўваходу ў жытло (мал. 5, *а*: *6*, мал. 3, *б*: *1*).

У межах пабудовы знойдзены 68 фрагментаў ляпнога глінянага посуду: 7 шыек, 1 донца, 60 сценак. Абсалютная большасць з іх (63 адзінкі) паходзяць ад гладкасценнага посуду; тры сценкі лошчаныя (у тым ліку дзве чарналошчаныя), дзве штрыхаваныя. Сярод іх – згаданы вышэй фрагмент шыйкі мілаградскага гаршка з «пярлінамі» пад краем венца (мал. 5, *б*: *10*). Аднак рэшта абломкаў належаць да рымскага часу. Яны паходзяць ад невялікіх гаршкоў закрытых форм характэрнай для помніка плаўнай прафіліроўкі. Венчыкі двух з іх упрыгожаны насечкамі і парнымі ямкамі па зрэзе (мал. 5, *б*: *6*, *9*). Адзін з абломкаў паходзіць ад мініяцюрнай пасудзіны (мал. 5, *б*: *4*). У аб'екце таксама знойдзены дзве маленькія кальцыніраваныя косткі і кавалак гліны з утопленым у яе жужалем.

**Вынікі агляду аб'ектаў, адкрытых на селішчы Яскавічы-1 у 2018 г.** У паўднёвай частцы раскопу завершана вывучэнне жытла 1, большая частка якога была даследавана Г. М. Бяліцкай у 2017 г. Па выніках прац двух сезонаў яно рэканструюецца як наземная пабудова зрубнай канструкцыі плошчай каля 19 м$^2$. У жытле адкрыты сляды трох агменяў. Яны маглі не толькі мець функцыю ацяпляльных прыстасаванняў, але і выкарыстоўвацца ў вытворчых працэсах. Характар знаходак (у першую чаргу гэта фрагменты металургічных тыгляў ці льячак, знойдзеныя як у запаўненні жытла (гл. [31, мал. 6: *2*]), так і вакол яго ў раскопе 2018 г. (гл. мал. 3, *б*: *16*), сведчаць аб спецыялізацыі гаспадара ў апрацоўцы каляровых металаў.

Вакол жытла 1 даследаваны аб'екты 6, 8–10, размешчаныя ў межах прапластка насычанага ліманітам суглінку. Верагодна, яны звязаны са здабычай і першаснай апрацоўкай жалезнай руды. Аб'екты 8 і 10 (ямы) маглі з'явіцца на месцы здабычы ліманіту. Пасля першаснай ачысткі і прасушкі руда перамешвалася з вугалем. Утвораная такім чынам металургічная шыхта складзіравалася на месцы здабычы – у ямах і вакол іх. Сюды таксама магла зносіцца здабытая недалёка руда. Верагодна, для захавання шыхты сухой быў зроблены адмысловы навес, слядамі якога з'яўляюцца дзве слупавыя ямы (аб'екты 6, 10). Пасля заканчэння выкарыстання гэтага вытворчага аб'екта было збудавана жытло, паўднёвая частка якога перакрыла аб'ект 8. Магчыма, з забеспячэннем тэхналагічных працэсаў плаўкі жалеза або апрацоўкі каляровых металаў звязаны даследаваны непадалёк невялікі, неглыбокі калодзеж (аб'ект 5).

У паўночнай частцы раскопу вывучана жытло 2 (аб'ект 7, 2018) слупавой канструкцыі плошчай каля 25 м$^2$. Як і жытло 1, яно характарызуецца слядамі апрацоўкі каляровых металаў: як у самой пабудове, так і ў непасрэднай яе блізкасці знойдзены абломкі тыгляў ці льячак, кроплі расплаўленага металу, а таксама пінцэт, які можа інтэрпрэтавацца як інструмент ювеліра.

Магчыма, да гэтага двара належалі два аб'екты, размешчаныя на поўдзень ад жытла 2. Адзін з іх, аб'ект 3, рэканструюецца як невялікая, плошчай каля 6 м$^2$, пабудова зрубнай канструкцыі з вялікай ямай унутры, верагодна, пограбам. Ямай гаспадарчага прызначэння, напэўна, з'яўляецца аб'ект 2. Пытанне інтэрпрэтацыі аб'екта 1, у якім разам з абломкамі посуду былі знойдзены пяць дробных кальцыніраваных костак, павінна застацца адкрытым да правядзення іх спецыяльнага аналізу.

## Аналіз матэрыялаў

Для таго каб вызначыцца з гісторыка-культурным кантэкстам матэрыялаў, атрыманых на селішчы Яскавічы-1 у 2018г., спынімся падрабязней на магчымасцях датавання, а таксама іх параўнальным аналізе на фоне сінхронных, культурна роднасных помнікаў.

**Датаванне і культурны кантэкст індывідуальных знаходак.** Усе рэчы, якія нясуць інфармацыю адносна хinduлогіі і даюць падставы для вызначэння гісторыка-культурнага кантэксту селішча Яскавічы-1, былі адкрыты ў 2018 г. па-за аб'ектамі – у культурным пласце – як падчас раскопак, так і ў выніку разведкі з металадэтэктарам, таму варта разглядаць іх у комплексе. Пры першасным падзеле – паводле крыніцы паходжання – яны распадаюцца на тры групы: 1) рэчы, несумненна, мясцовага паходжання (кола культур усходнееўрапейскай лясной зоны); 2) знаходкі, якія павінны ўспрымацца як імпарт альбо запазычанні з культур цэнтральнаеўрапейскага Барбарыкума; 3) рымскі імпарт (адна знаходка).

Адзіны знойдзены на помніку ў 2018 г. імпарт з Рымскай імперыі – срэбны дынарый імператара Камода (мал. 3, *a*: *1*) – не дае падстаў для абсалютнага датавання. Манета была адбіта ў 183–184 гг., аднак перыяд хаджэння срэбных рымскіх дынарыяў на тэрыторыі еўрапейскага Барбарыкума быў вельмі працяглы. Манетна-рэчавыя скарбы, адкрытыя на тэрыторыі Беларусі, сведчаць пра тое, што выробленыя з якаснага срэбра манеты пачатку імперскага перыяду маглі заставацца тут у выкарыстанні да першай паловы – сярэдзіны V ст. [32].

Асноўны блок металічных рэчаў, атрыманых на селішчы Яскавічы-1 у 2018 г., утвараюць вырабы мясцовага паходжання – гарызонту ўсходнееўрапейскіх выемчатых эмалей. Пад гэтым паняццем аб'ядноўваецца комплекс упрыгожанняў і дэталей касцюма (фібулы, падвескі, грыўны, ланцугі, галаўныя венчыкі, пярсцёнкі, шпількі і інш.) і рэчаў элітарнай, у тым ліку ваярскай, культуры (шпоры, рытоны, бізуны), якія ўпрыгожваліся ўстаўкамі са шкла рознага колеру. Верагодна, тэхналогія іх вырабу была запазычана ў правінцыйна-рымскіх рамеснікаў [33]. У сярэдзіне – другой палове II ст. яна імкліва распаўсюджвалася, і на землях Прыбалтыкі ды ў глыбіні ўсходнееўрапейскай лясной зоны з'явіўся шэраг лакальных цэнтраў вытворчасці рэчаў у стылі «варварскіх» эмалей, найбуйнейшыя з якіх лакалізаваліся ў Сярэднім Падняпроўі і левабярэжжы Дняпра – у арэале кіеўскай культуры (гл. спіс літаратуры ў [34–37]). У познярымскі час, з канца II – пачатку III ст., іх вырабы распаўсюджваюцца на агромністай прасторы: ад польскіх Мазур і Прыбалтыкі на захадзе да Паволжа на ўсходзе і ад Паўднёвай Скандынавіі на поўначы да Паўночнага Прычарнамор'я на поўдні. У гэтым арэале касцюм рознакультурнага насельніцтва, аб'яднаны прысутнасцю рэчаў з выемчатымі эмалямі, дапаўняўся лакальнымі вырабамі згодна з традыцыямі кожнай з гісторыка-культур-ных супольнасцей. Датаванне гэтых рэчаў з'яўляецца дастаткова складанай задачай, паколькі іх абсалютная маса знойдзена па-за комплексамі (найчасцей выпадкова або ў культурным пласце селішчаў ці ў скарбах). Таму высновы пра іх датаванне робяцца на падставе пошуку прататыпаў, канструктыўных і стылістычных аналогій з іншымі вырабамі, а таксама назіранняў за эвалюцыяй форм і спосабаў арнаментацыі рэчаў кола «варварскіх» выемчатых эмалей.

Як адзначалася вышэй, селішча Яскавічы-1 стала вядомае дзякуючы аматарскім знаходкам менавіта такіх рэчаў: у 2017 г. скарбашукальнікі выявілі тут дзве лунніцы з эмалямі [31, мал. 7: *3*, *4*]. Падчас даследаванняў Г. М. Бяліцкай у межах жытла 1 была адкрыта яшчэ адна лунніца, а на плошчы помніка – фрагменты дзвюх трохвугольных фібул [31, с. 270–272, мал. 6: *1*, мал. 7: *1*, *2*]. У 2018 г. у выніку разведкі з выкарыстаннем металадэтэктара ў Яскавічах знойдзены яшчэ 5 цэлых і фрагментаваных вырабаў з эмалевымі ўстаўкамі: падкovападобная фібула (мал. 3, *a*: *2*), чатыры лунніцы і іх фрагменты (мал. 3, *a*: *3–6*). Атрыманыя на яскавіцкім селішчы 10 вырабаў з эмалямі дазваляюць параўноўваць яго па колькасці знаходак рэчаў з эмалевымі ўстаўкамі з такімі буйнымі і добра вывучанымі помнікамі верхнедняпроўскага варыянта кіеўскай культуры, як селішчы ў Абідні і Тайманава (гл. [38, с. 214–217, рис. 16: *1–5*, *11*; 39, рис. 5: *6*, *7*, рис. 8: *3*]).

Тыпалагічна найбольш ранняй рэччу кола «варварскіх» эмалей у яскавіцкай калекцыі трэба лічыць падкovападобную фібулу (мал. 3, *a*: *2*). Яна належыць да тыпу 1В VI балтыйска-днепра-окскай серыі паводле класіфікацыі Я. Г. Гарахоўскага або да тыпу II згодна з тыпалогіяй А. Яблоньскай, гэтыя тыпы датуюцца III ст. [40, с. 31; 41, s. 125–128; 36, с. 118, 120–123]. У апошнія гады назіраецца тэндэнцыя да састарэння іх датавання. На прыкладзе пахаванняў багачэўскай культуры, адкрытых на тэрыторыі Літвы, Г. Бітнер-Врублеўская прадэманстравала, што падобныя фібулы пачалі выкарыстоўвацца з фінальнага адрэзка фазы $B_2$ і на фазе $B_2/C_1$–$C_{1a}$ (у межах сярэдзіны II – пачатку III ст.) і маглі заставацца ў выкарыстанні на фазе $C_{1в}$–$C_2$ (да сярэдзіны ці другой паловы III ст. уключна) [42, с. 172–173, 179–180, рис. 1, 4]. На Беларускім Палессі вядомая яшчэ адна (выпадковая) знаходка фібулы тыпу VI.1 паводле класіфікацыі Я. Г. Грахоўскага, выяўленая каля в. Сігневічы, што на Ясельдзе [28, мал. 8: *8*][6].

[6]Сярод найбольш блізкіх аналогій да яскавіцкай падкovападобнай фібулы можна згадаць зашпільку з Бакшай, што ў Літве, якая, як і яскавіцкая, мае характэрныя круглыя выступы на вуглах верхняга гнязда, але вызначаецца большымі памерамі і масіўнасцю (гл. [34, рис. 28: 6]).

Фрагмент лунніцы з проразямі на плечыках і трохвугольнымі лопасцямі па перыметры гнёздаў (мал. 3, *а*: *5*) належыць да тыпу IIIГ1 паводле класіфікацыі І. К. Фралова [43]. Ад тыпалагічна блізкай лунніцы паходзіць таксама абломак з трохвугольнымі эмалевымі палямі на плечыках (мал. 3, *а*: *6*). Стылістычна больш позняй з'яўляецца цэлая лунніца з выступамі на целе (мал. 3, *а*: *3*) тыпу IVA3 паводле класіфікацыі І. К. Фралова. Блізкай да апошняй мусіла быць лунніца, ад якой захаваўся абломак плечыка (мал. 3, а: *4*). Усе гэтыя падвескі-лунніцы могуць быць аднесены да сярэдняга этапу развіцця вырабаў кола выемчатых эмалей, храналагічныя рамкі якога вызначаюцца А. М. Абломскім і Р. У. Цярпілоўскім як канец II – сярэдзіна – другая палова III ст. [36, с. 119–121].

Касцюм жыхароў яскавіцкага селішча дапаўняўся элементамі без эмалевых уставак, стыль выканання якіх адпавядаў агульнай эстэтыцы гэтага культурнага асяроддзя.

Сярод такіх рэчаў трэба ў першую чаргу адзначыць пранізку цыліндрычнай формы, скручаную з тонкай бронзавай бляхі (мал. 3, а: *14*). Такія пронізі шырока прадстаўлены ў старажытнасцях гарызонту выемчатых эмалей, найперш познезарубінецкіх груп і кіеўскай культуры, у тым ліку на помніках з Беларусі [44, с. 28, рис. 18: *3*, *4*, рис. 20: *6–8*, рис. 22: *9*, рис. 24: *1*, *2*, рис. 26: *7*; 38, с. 217–219, рис. 18: *5*, *7*, *8*]. Яны з'яўляліся пераважна элементам караляў, у складзе якіх дапаўняліся пацеркамі, драцянымі спіральнымі пранізкамі і аздобленымі эмалямі падвескамі-лунніцамі (гл. [45]).

Да рэчаў без эмалевых уставак належыць і пярсцёнак, скручаны з фрагмента бранзалета (мал. 3, *а*: *9*). Дакладныя аналогіі такіх бранзалетаў мне невядомыя. Характэрнай дэталлю з'яўляецца патоўшчаная пляцоўка на канцы. Яна дазваляе меркаваць, што яго аддаленымі прататыпамі маглі з'яўляцца так званыя змяінагаловыя бранзалеты, тыповыя для старажытнасцей паўднёвага ўзбярэжжа Балтыйскага мора, перш за ўсё вельбарскай культуры, дзе розныя іх варыянты прадстаўлены на працягу раннярымскага і пачатку познярымскага перыяду – да фаз $C_{1b}$–$C_2$ уключна [46]. Змяінагаловыя бранзалеты інспіравалі з'яўленне блізкіх форм у насельніцтва шэрагу суседніх культур. Найбольш яркімі прыкладамі могуць служыць іх самбійскія дэрываты [47, rys. 10; 48, Taf. 22, Taf. 97: *5–7*; 49] або бранзалеты тыпу *Каменьчык*, характэрныя для помнікаў усходняга варыянта пшэворскай культуры [47, s. 320–321, rys. 5, rys. 6: *a*, *b*]. У аздабленні як ранніх варыянтаў змяінагаловых бранзалетаў, так і вытворных ад іх форм выкарыстоўваліся ланцужкі наколаў уздоўж па прадольнай восі, якія мы таксама назіраем на фрагменце бранзалета з селішча Яскавічы-1. Аналігічным чынам упрыгожаны фрагмент бранзалета з трохвугольнага ў сячэнні брусочка (мал. 3, *а*: *10*). Пярсцёнак, скручаны з абломка падобнага бранзалета, вядомы па даследаваннях Г. М. Бяліцкай на селішчы Давыд-Гарадок, што ў нізоўях Гарыні [29, мал. 19: *1*].

Форма і характар арнаментацыі фрагмента вырабу з шырокай стужкі (мал. 3, *а*: *13*) таксама дазваляе разглядаць яго як абломак бранзалета. На тэрыторыі Беларусі можна адзначыць абломак з падобным арнаментам, знойдзены на селішчы постзарубінецкага гарызонту ў Курадаве [50, с. 100, мал. 3: *14*]. Фрагмент бранзалета з шырокай стужкі, упрыгожаны складанай гравіраванай кампазіцыяй, вядомы на селішчы верхнедняпроўскага варыянта кіеўскай культуры Тайманава [39, рис. 4: *11*].

Касцюм жыхароў селішча Яскавічы-1 дапаўнялі рэчы, ідэя якіх была запазычана ў насельніцтва цэнтральнаеўрапейскага Барбарыкума, або безумоўныя імпарты з гэтага культурнага кола. Іх аналіз дазваляе ўдакладніць датаванне для гарызонту рымскага перыяду, а таксама выказаць некаторыя назіранні адносна сувязей, у якія былі ўключаны жыхары яскавіцкага селішча.

Тыпалагічна найбольш ранняй рэччу, якая павінна разглядацца ў гэтым кантэксце, з'яўляецца пласцінкавы наканечнік рэменя (мал. 3, *а*: *8*). Ён належыць да тыпу 9.1 групы IV паводле класіфікацыі Р. Мадыды-Легутка. Жалезныя наканечнікі тыпу ML-9.1 з'яўляюцца ў старажытнасцях пшэворскай культуры яшчэ ў фазе $A_2$ позняга перадрымскага часу (каля 150–70 гг. да н. э.), але вырабленыя са сплаваў медзі наканечнікі датуюцца ў Цэнтральнай Еўропе ў межах фаз $B_1$–$C_{1a}$ рымскага часу (каля 10–40 – 220 гг.) [51, s. 71–72, 75–76]. Звузіць гэта датаванне дазваляюць назіранні за іх распаўсюджаннем: бронзавыя наканечнікі ML-9.1 былі пашыраны ў Палаб'і, на тэрыторыі Карпацкай катлавіны, паўднёва-заходняга ўзбярэжжа Балтыкі і Паўночнай Польшчы [51, s. 71–72, 75–76]. Іх знаходкі невядомыя мне ў старажытнасцях усходнееўрапейскай лясной зоны. Найбольш верагодным падаецца, што да жыхароў селішча Яскавічы-1 гэта дэталь пояса трапіла ў выніку непасрэдных кантактаў з насельніцтвам вельбарскай культуры, якое з'яўляецца ў Прыпяцкім Палессі ў фазе $B_2/C_1$–$C_{1a}$ (каля 160–180 – 200–220 гг.) [52, с. 394, табл. 1]. З улікам гісторыка-культурнай сітуацыі ў даследуемым рэгіёне датаванне наканечніка рэменя з селішча Яскавічы-1 можна абмежаваць апошнімі дзесяцігоддзямі II – пачаткам III ст.

Да больш позняга часу трэба аднесці сякерападобную падвеску тыпу III паводле класіфікацыі А. Какоўскага (мал. 3, *а*: *7*). Такія падвескі з'яўляюцца ў Цэнтральнай Еўропе не раней чым у фазу $C_2$ познярымскага часу (каля 260–300 гг.) [53, с. 101–102]. Ва ўсходнееўрапейскай лясной зоне знаходкі сякерападобных падвесак павінны разглядацца як імпарт з культур гоцкага кола – вельбарскай і чарняхоўскай. У гэтым кантэксце яны адзначаны таксама на землях Беларусі, у тым ліку каля в. Івань

Слуцкага раёна – прыкладна за 40 км на поўнач ад селішча Яскавічы-1 [54, с. 64–66, рис. 1: *4*, *5*].

У цэлым фрагмент срэбнай арбалетападобнай фібулы тыпу A.162 паводле тыпалогіі О. Альмгрэна [55] сінхронны сякерападобнай падвесцы (мал. 3, *б*: *4*). Найбольш блізкія аналогіі па форме і сячэнні спінкі можна адзначыць сярод зашпілек варыянтаў ZM-71 і ZG-79 паводле класіфікацыі А. Какоўскага, якія датуюцца ў старажытнасцях масламенцкай групы і вельбарскай культуры пераважна фазай $C_2$ познярымскага перыяду (каля 260–300 гг.), але маглі заставацца ў выкарыстанні ў першай палове IV ст. [56, s. 39, tab. II: *1*, *2*; 57, s. 14, 43, ryc. 2: *j*, *k*; 58, S. 62, Abb. 34; 59, p. 40–41, 99–100, 131–133, pl. XXXIII/Gr. 75: *1*, pl. CLXVII/Gr. 379: *1*, *2*] (гл. таксама [60, S. 465–470]).

Як адзначалася вышэй, на падставе ўмоў залягання і супадзення памераў можна меркаваць, што рамка і язычок (мал. 3, *б*: *2*, *3*) паходзяць ад адной спражкі. У цэнтральнаеўрапейскім Барбарыкуме аналогіі можна адзначыць сярод спражак тыпаў *H.11*, *16*, *17* або мініяцюрных форм H.25, 26 паводле класіфікацыі Р. Мадыды-Легутка. Спражкі гэтага кола з'яўляюцца ў фазе $C_2$ і выкарыстоўваюцца да ранніх этапаў эпохі Вялікага перасялення народаў уключна – прыкладна з 260 па 450–460 гг. [61, s. 63–66]. У чарняхоўскай культуры тыпалагічна блізкія спражкі тыпу Д паводле класіфікацыі Я. Л. Гарахоўскага характарызуюць развітыя і познія яе фазы – пераважна IV ст. [62, с. 45, таб. 1, 62, 72, 73].

На селішчы Яскавічы-1 знойдзены таксама два фрагменты, магчыма, ад адной паясной абоймы, датаванне якой не можа быць вызначана межамі больш вузкімі, чым рымскі час (мал. 3, б: *11*, *12*).

Нарэшце, у кантэксце сувязей і перайманняў з кола культур цэнтральнаеўрапейскага Барбарыкума можа разглядацца абломак пінцэта (мал. 3, *б*: *1*). Пінцэты, як катэгорыя туалетных, медыцынскіх і ювелірных прылад, пакуль не дачакаліся комплекснага аналізу. Аднак экзэмпляр з селішча Яскавічы-1 па форме, памерах, прапорцыях і матэрыяле знаходзіць аналогіі, найперш сярод пінцэтаў рымскага часу, якія прадстаўлены ў тым ліку на помніках вельбарскай культуры [63; 64, s. 20–21]. У дачыненні да яскавіцкай знаходкі немагчыма вызначыць, з'яўляецца яна імпартам ці мясцовым вырабам, ідэя якога была запазычана, верагодней за ўсё, у насельніцтва Цэнтральнай Еўропы. На тэрыторыі Беларусі ў культурна блізкім кантэксце знаходка пінцэта вядомая на селішчы Тайманава ў Верхнім Падняпроўі [39, рис. 4: *12*].

Такім чынам, на падставе датавання прадстаўленых знаходак рымскі гарызонт селішча Яскавічы-1 папярэдне можна вызначыць межамі, якія адпавядаюць фазам $B_2/C_1–C_{1a}$ – $C_2/C_3$ адноснай храналогіі культур Цэнтральнай Еўропы: прыкладна з другой паловы або канца II па пачатак альбо сярэдзіну IV ст. Пры гэтым большасць знаходак датуюцца III ст. Пласцінкавы наканечнік пояса ўказвае на тое, што ў рымскі час яскавіцкае селішча пачало выкарыстоўвацца не пазней чым на рубяжы II–III стст., што ў цэлым супадае з датаваннем разгледжанай вышэй падкovападобнай фібулы кола эмалей. Знаходка сякерападобнай падвескі з відавочнасцю дэманструе, што жыхары селішча працягвалі кантактаваць з насельніцтвам вельбарскай культуры як мінімум да канца III ст. На прыкладзе шэрагу рэчаў (арбалетапабодная фібула, дэталі пояса) можна адзначаць больш позні імпарты і перайманні элементаў касцюма з варварскага свету Цэнтральнай Еўропы.

Нягледзячы на тое што сярод разгледжаных элементаў касцюма вызначаюцца даволі шматлікія імпарты і перайманні ад насельніцтва цэнтральнаеўрапейскага кола, вельбарскай і чарняхоўскай культуры, гэтыя ўплывы толькі эпізадычна адзначаюцца ў штодзённай побытавай культуры жыхароў селішча Яскавічы-1. У яе аснове, безумоўна, ляжала мясцовыя традыцыя кола культур усходнееўрапейскай лясной зоны. Так, непасрэдныя аналогіі ў апошняй знаходзяць найбольш масава распаўсюджаныя прылады працы – гліняныя праселкі. Нізкія, біканічнай або бачонкападобнай формы праселкі з шырокімі адтулінамі тыповыя для старажытнасцей познезарубінецкага тыпу і кіеўскай культуры (сярэдзіна I – IV ст.) з тэрыторыі Сярэдняга Падняпроўя і Дняпроўскага левабярэжжа і адпавядаюць тыпам 3, 5–8 у класіфікацыі А. М. Абломскага [3, с. 55–57, рис. 16]. Яны прадстаўлены на помніках постзарубінецкага і «передпражскага» гарызонту Прыпяцкага Палесся [27, с. 355, мал. 5, Б: *16* і В: *8–12*, мал. 9, А: *10*; 29, мал. 9: *1*, мал. 19: *7–10*] і масава выступаюць у матэрыялах верхнедняпроўскага варыянта кіеўскай культуры [65; 38, с. 208–210, рис. 11].

Вырашальнае значэнне для вызначэння культурнага кола, да якога належалі жыхары яскавіцкага селішча, мае аналіз найбольш масавага элемента матэрыяльнай культуры – глінянага посуду.

**Да характарыстыкі керамічнага комплексу.** Сезон 2018 г. стаў толькі другім у вывучэнні селішча Яскавічы-1. Пакуль можна скласці толькі папярэдняе ўяўленне аб посудзе рымскага гарызонту гэтага помніка. Тым не менш сцісла спынімся на коле аналогій, якія магчыма вызначыць ужо сёння.

На падставе акрэсленага вышэй датавання і назіранняў за прафіліроўкай найбольш характэрных абломкаў і спосабамі апрацоўкі паверхні, познярымскі гарызонт селішча павінен суадносіцца з кіеўскім культурным колам (гл. [4, таб. 9, с. 35–42; 5, рис. 8, с. 44–47; 7, с. 19–20, рис. 1]). У апошнім найбольш блізкія аналогіі да керамічнага комплексу з Яскавічаў можна адзначыць у матэрыялах селішча Абідня – аднаго з эталонных помнікаў яе верхнедняпроўскага варыянта, якое існавала ў канцы II – пачатку IV ст. [38, с. 242], гэта значыць у час, сін-

хронны асноўнай частцы матэрыялаў, адкрытых на селішчы Яскавічы-1.

Як адзначалася вышэй, керамічны комплекс яскавіцкага селішча характарызуюць найперш гаршкі закрытых форм з плаўным *s*-падобным выгінам шыек і акруглымі плечыкамі, размешчанымі вышэй сярэдзіны вышыні пасудзін (мал. 7: *3*, *4*, мал. 9: *9–32*, мал. 8: *1*, *10*, мал. 10: *4–6*, *8*, *10*, мал. 12, *б*: *1*, *2*, мал. 13, *а*: *1*, мал. 5, *б*: *7*). Гэтыя формы суадносяцца з гаршкамі тыпаў I1A і I3A паводле тыпалогіі А. М. Абломскага і Р. У. Цярпілоўскага (гл. [4, табл. 9]). У схемах, распрацаваных для фрагментаванага керамічнага матэрыялу, найбольш блізкія адпаведнікі адзначаюцца сярод форм тыпу SC1, вылучанага А. У. Ільюцік для селішча Абідня, якія ўключаны М. В. Лапаціным і А. Г. Фурасьевым пераважна ў тыпы 1, 7, 8, што характарызуюць набор абідненскай традыцыі і генетычна з ёй звязаны посуд помнікаў Верхняга Падняпроўя і Падзвіння [66, рис. 9; 38, с. 203, рис. 7: *6–21*; 67, с. 33, 36, рис. 11, 18, 19]. Для селішча Яскавічы-1 нехарактэрныя рабрыстыя формы. У матэрыялах з раскопак 2018 г. гэта адзінкавыя абломкі місападобных пасудзін і гаршкоў (мал. 8: *7*, *11*, *15*). Рабрыстыя гаршкі значна шырэй прадстаўлены на помніках кіеўскай культуры Сярэдняга Падняпроўя, Падзясення і Дняпроўскага левабярэжжа, асабліва на сярэднім і познім этапах іх развіцця [7, с. 40; 68, с. 40–44]. На эталонным селішчы верхнедняпроўскага варыянта кіеўскай культуры Абідня іх доля не перавышае 10 % [38, с. 203]. У Верхнім Падняпроўі тэндэнцыя да больш вострага прафілявання посуду нарастае з рубяжа III–IV стст., калі тут адбываецца змена культурнай традыцыі: з Падзясення сюды перасяляюцца групы роднаснага кіеўскага насельніцтва, якое ў гэты час саступала свае землі носьбітам чарняхоўскай культуры; у беларускім Падняпроўі мясцовае насельніцва абідненскай традыцыі выцясняецца і мігруе на поўнач уверх па Дняпры (гл. [69; 67; 70]).

Агульнае падабенства керамічнага комплексу селішчаў у Яскавічах і Абідні падкрэсліваецца таксама характарам апрацоўкі паверхні посуду. Так, у кіеўскай культуры Сярэдняга Падняпроўя і Дняпроўскага левабярэжжа традыцыя пакрыцця паверхні гаршкоў штрыхоўкай і расчэсамі адзначаецца не на ўсіх помніках і звязваецца з пранікненнямі груп насельніцтва з тэрыторыі паўднёва-ўсходняй Беларусі, пераважна ў постзарубінецкі перыяд (у I–II стст.). Тут яна не атрымала распаўсюджання і практычна цалкам знікла на сярэднім і познім этапах развіцця кіеўскай культуры [7, с. 41, 47; 68, с. 41–42, 46]. У Верхнім Падняпроўі на эталонным селішчы Абідня доля абломкаў посуду з расчэсамі складае 11,5 %, са штрыхоўкай – каля 5 %, лошчаных і падлошчаных – 2,7 % [66, с. 17; 38, с. 203]. Разам з тым пры параўнанні калекцыі 2018 г., сабранай у Яскавічах, з керамічным комплексам верхнедняпроўскага варыянта кіеўскай культуры можна таксама адзначыць некаторыя адрозненні. У параўнанні з посудам Абідні керамічны набор яскавіцкага селішча характарызуе супастаўляльны ўдзел абломкаў штрыхаванага (каля 6 %) і лошчанага (каля 4 %) посуду пры значна радзейшым выкарыстанні ў апрацоўцы паверхні расчэсаў (толькі 6 адзінак).

Выразныя аналогіі з наборам посуду з Яскавічаў трэба адзначыць таксама ў матэрыялах цэнтральнага Палесся больш ранняга – постзарубінецкага – гарызонту (каля 10–40 – 200–220 гг.). Керамічны комплекс найбольш рэпрэзентатыўных помнікаў, якія вывучаліся ў парэччы Прыпяці – селішча Курадава і Давыд-Гарадок – вылучаецца перавагай гаршкоў закрытых форм з выгнутымі шыйкамі [50, мал. 4: *2–4*, мал. 6: *1*; 71, мал. 7: *4*, *8*, *10*, *13*, мал. 8: *1*, *3*, *4*, *19*, *20*, *26*, мал. 9: *2*, *3*, *4*; 27, рис. 2: *1*, *2*, *4–9*, рис. 4: *1–13*; 28, мал. 6: *2*, *4–9*, мал. 7: *1–12*, *14*, *15*]. Пры гэтым посуд з селішча Курадава, якое пачынае выкарыстоўвацца з першай паловы I ст., вызначае тэндэнцыя да больш вострага прафілявання [50, мал. 4: *2–4*, мал. 6: *1*; 71, мал. 7: *4*, *8*, *10*, *13*, мал. 8: *1*, *3*, *4*, *19*, *20*, *26*, мал. 9: *2–4*]. Больш плаўная прафіліроўка форм характарызуе керамічны комплекс Давыд-Гарадка, выкарыстанне якога засведчана з другой паловы II – рубяжа II–III стст. Доля абломкаў з расчэсамі складае да 4 % у Курадаве, і, таксама як у Яскавічах, яны прадстаўлены ў Давыд-Гарадку [50, с. 95; 71, с. 116]. Посуд постзарубінецкага гарызонту з падобнымі характарыстыкамі вядомыя і на поўначы цэнтральнага Палесся – у тым жа рэгіёне, у якім месціцца селішча Яскавічы-1. Найбольш ярка такія матэрыялы прадстаўлены па селішчах Старыя Юрковічы і Любань (Любанскі раён) [72, с. 127–128, мал. 6–8; 27, с. 290–291, рис. 6, А, рис. 8; 28, с. 365–367, мал. 10, Б].

Сувязь яскавіцкіх матэрыялаў з мясцовымі старажытнасцямі постзарубінецкага гарызонту можна праілюстраваць на прыкладзе некаторых спецыфічных прыёмаў апрацоўкі паверхні і прафіліроўкі асобных форм. Так, у матэрыялах селішча Давыд-Гарадок знаходзіць аналогію тэхніка выраўноўвання паверхні з дапамогай трэскі ці ганчарнага нажа (мал. 9: *4*, *7*) [71, с. 116]. Прыём падкрэслівання асновы шыйкі гарызантальнай баразёнкай (мал. 12, *а*: *1*) адзначаецца ў матэрыялах селішчаў Давыд-Гарадок і Старыя Юрковічы [71, мал. 12: *10*; 28, мал. 7: *18*, мал. 11: *10*]. Аднак гэтыя элементы характэрныя перш за ўсё для ганчарнай традыцыі постзарубінецкіх помнікаў беларускага Пабужжа, дзе яны прадстаўлены значна шырэй, чым на Палессі, і лепш за ўсё могуць быць праілюстраваны матэрыяламі грунтавога могільніка каля в. Радасць (Камянецкі раён) [73, с. 244–253, мал. 12/22: *2*, *3*, мал. 12/23: *2*]. На апошнім можна заўважыць таксама спецыфічны прыём храпавачэння, які адзначаны таксама ў Яскавічах: уціранне ў вільготную сценку пасудзіны дробнай жарствы і пяску (мал. 6, *14*) [73, мал. 11: *1*]. Гэты вельмі спецыфічны спосаб храпавачэння характарызуе таксама помнікі культу-

ры позняй штрыхаванай керамікі, прычым адзначаецца ён толькі на Панямонні. А. М. Мядзведзеў прыводзіць звесткі аб тым, што доля такога «ашурпачанага» посуду на гарадзішчах Панямоння можа дасягаць 17 %; тут адзначаюцца і выпадкі «гібрыднага ашурпачвання», калі слой такой храпаватасці наносіўся на ўнутраны бок, а знешні быў пакрыты штрыхоўкай [74, с. 37–38]. У Яскавічах на асобных абломках слой храпаватасці быў нанесены паверх штрыхоўкі і расчэсаў (мал. 6: *15*, *17*). Сувязямі з насельніцтвам культуры позняй штрыхаванай керамікі можна патлумачыць наяўнасць на яскавіцкім селішчы фрагментаў штрыхаванага посуду, аздобленых па плечыку пальцавымі зашчыпамі і ямкавымі ўціскваннямі (мал. 8: *5*, *10*), ці абломка гладкасценнага гаршка з гарызантальным ланцужком неглыбокіх парных пальцавых уцісканняў (мал. 8: *2*) [74, с. 43, рис. 82; 75, с. 76–77, табл. 43, 44].

У кантэксце сувязей з насельніцтвам культуры штрыхаванай керамікі можа разглядацца таксама традыцыя штрыхавання паверхні. Апісаныя вышэй спосабы нанясення штрыхоўкі, як і выпадкі яе пазнейшага загладжвання, вядомыя ў культуры позняй штрыхаванай керамікі [75, с. 76]. Аднак гэта рыса керамічнага комплексу яскавіцкага селішча павінна ўспрымацца як ужо ўкаранёная, адаптаваная ў мясцовых традыцыях, якая бярэ пачатак як мінімум з постзарубінецкага часу: у матэрыялах паўночнапалескіх помнікаў гэтага кола доля абломкаў штрыхаванай керамікі можа дасягаць паловы [28, с. 367].

Такім чынам, ёсць падставы меркаваць, што матэрыялы, прадстаўленыя ў гарызонце познярымскага часу селішча Яскавічы-1, генетычна звязаны з мясцовым насельніцтвам Беларускага Палесся больш ранняга, постзарубінецкага гарызонту. Гэту генетычную пераемнасць можна таксама праілюстраваць іншымі элементамі матэрыяльнай культуры: шырокім распаўсюджаннем тут у I–II стст. праселак з шырокімі адтулінамі характэрнай нізкай біканічнай, цыліндрычнай або бачонкападобнай формы, а таксама адзначанымі вышэй аналогіямі ва ўпрыгожаннях і дэталях касцюма, у тым ліку гарызонту выемчатых эмалей (гл. [27; 28]).

У заключэнне аналізу матэрыялаў, атрыманых на селішчы Яскавічы-1 у 2018 г. варта падкрэсліць яшчэ адзін элемент керамічнага комплексу, які знаходзіць адпаведнік у рэчавых знаходках. У ім вылучаюцца асобныя фрагменты посуду, якія, відавочна, належаць да іншай культурнай традыцыі. Найбольш выразна яны прадстаўлены двума малымі фрагментамі падлошчаных гаршкоў вельбарскай культуры тыпу IA паводле класіфікацыі Р. Валангевіча (мал. 6: *9*, *10*) (гл. [76]). Магчыма, да гэтай культуры таксама належыць адзіны знойдзены ў Яскавічах фрагмент ручкі, верагодна, ад збанка (мал. 6: *7*). Посуд мае крэмава-светла-карычневы колер, кераміка мяккая на дотык, у цесце прысутнічаюць дамешкі шамоту. Гэтыя абломкі гаршкоў адпавядаюць форме і вытворчай тэхналогіі вельбарскай культуры і павінны ўспрымацца як імпарт. Яшчэ выразней гэты вектар сувязей праяўляецца ў рэчавых знаходках з металаў: як імпарты з культур гоцкага кола (вельбарскай і чарняхоўскай) павінен трактавацца наканечнік рэменя і сякерападобная падвеска (мал. 3, *б*: *7*, *8*), напэўна, праз пасрэдніцтва паўднёвых суседзяў да жыхароў яскавіцкага селішча трапіў і рымскі срэбны дынарый (мал. 3, *б*: *1*). З гэтым жа кірункам сувязей павінна суадносіцца распаўсюджанне ў строі жыхароў яскавіцкага селішча элементаў касцюма насельніцтва цэнтральнаеўрапейскага Барбарыкума, такіх як арбалетападобная фібула і дэталі пояса (мал. 3, *б*: *2–4* і *а*: *11*, *12*) (гл. [77; 78, с. 419–437]). Прычым трэба казаць пра беспасрэднае кантактаванне ў паўночным Палессі насельніцтва кіеўскага культурнага кола з носьбітамі вельбарскай культуры: бліжэйшыя помнікі апошняй сёння вядомыя прыкладна за 30–40 км на поўдзень і паўднёвы захад ад Яскавічаў (мал. 1, III).

## Заключэнне

У 2018 г. на селішчы Яскавічы-1 вывучаны ўчастак плошчай 364 м$^2$, на якім адкрыты рэшткі дзвюх сядзіб. Даследаваныя на помніку жылыя пабудовы (жытло 1 і жытло 2) вызначаюцца слядамі апрацоўкі каляровых металаў, на што ўказваюць абломкі тыгляў для плаўкі, кроплі расплаўленага металу і, магчыма, ювелірны пінцэт. З выплаўкай жалеза могуць звязвацца адкрытыя ў паўднёвай частцы раскопу аб'екты, часткова перакрытыя жытлом 1, – верагодна, гэта было месца здабычы і падрыхтоўкі да плаўкі шыхты. Такім чынам, Яскавічы-1 можна ахарактарызаваць як селішча з выразным рамесным кампанентам, жыхары якога спецыялізаваліся на металаапрацоўцы. Папярэдне час выкарыстання помніка ў рымскі перыяд можна вызначыць межамі, якія адпавядаюць фазам $B_2/C_1$–$C_{1a}$ – $C_2/C_3$ у адноснай храналогіі культур Цэнтральнай Еўропы: прыкладна з другой паловы – канца II па пачатак альбо сярэдзіну IV ст. Пры гэтым датаванне, вызначанае для большасці знаходак, прыпадае на III ст. Паводле асноўных характарыстык матэрыяльнай культуры, селішча Яскавічы-1 павінна звязвацца з кіеўскім культурным колам. Вынікі параўнання асноўных элементаў матэрыяльнай культуры – формы, тэхналогіі вырабу і характару апрацоўкі посуду, прылад працы, упрыгожанняў і элементаў касцюма – папярэдне дазваляюць разглядаць яе як працяг эвалюцыі мясцовых, цэнтральнапалескіх

старажытнасцей постзарубінецкага гарызонту (сярэдзіна I – рубеж II–III стст.).

